
ЯК ЗРАЗУМЕЦЬ ПАДЛЕТКА? Сямейная газета

КРОКІ ДА «ЗЯЛЁНЫХ» ГАРАДОЎ 13


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

13 СНЕЖНЯ 2018 г. ЧАЦВЕР № 240 (28856)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Іван ЖУК, першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама:**

*«Тэма супрацьдзеяння карупцыі ў сістэме мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў шырокая. Яна датычыцца ў першую чаргу паводзін чыноўнікаў, кіраўнікоў, якія з-за сваіх службовых магчымасцяў могуць учыняць супрацьпраўныя дзеянні. У гродзенскім рэгіёне гэтаму пытанню аддаецца шмат увагі: камісіі па супрацьдзеянні карупцыі ў органах улады створаны на ўзроўні вобласці і раёнаў. У цэнтры ўвагі — арганізацыя кантролю, аказанне дапамогі дзяржорганам, якія адказваюць за захаванне законнасці і парадку. Немалаважнае пытанне — этычныя паводзіны, стаўленне да службы самога кіраўніка. Ад гэтага залежыць і стаўленне людзей да ўлады».*

# Час рыхтаваць падарункі



Фота БелТА

Навучэнцы Магілёўскага дзяржаўнага эканамічнага прафесійна-тэхнічнага каледжа разам са сваімі педагогамі рыхтуюцца да свята — у планах вырабіць больш як паўтары тысячы сувеніраў да Новага года: карціны, сурвэткі, ёлачкі з саломы, калядныя вянкі, календары... Ну і, канешне, фігуркі свінак. Сімвал наступнага года будзе надзвычай папулярны, асабліва калі парасяткі такія сімпатычныя, як гэтыя, што трымаюць у руках навучэнкі каледжа Людміла МАЗУРАВА і Аляксандра ОКУНЕВА.

## КОРАТКА

**• У Беларусі плануецца зняць абмежаванні па мэтавым наборы ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы.**

• Новы аформлены ў фірмовых колерах World of Tanks самалёт «Белавія» прызямліўся ў Нацыянальным аэрапорце Мінск.



**• У Брэсце адбылося ўрачыстае адкрыццё футбольнага манежа.**

• Штогод Беларусь вырабляе для IKEA мэблю, тэкстыль, аксесуары на 80 млн еўра. Гэтыя тавары рэалізуюцца ў крамах шведскага канцэрна па ўсім свеце.

Спажывец

## У электрычках — марожанае, у рэстаранах — дрэс-код

### Якія змены чакаюць гандаль і грамадскае харчаванне ў наступным годзе

**Пакет для фруктаў вам абавязаны будуць выдаць бясплатна, пральную машыну данясуць да аўто, а ў рэстаран могуць не пусціць у красоўках. З 21 лютага наступнага года ўступае ў сілу пастанова Саўміна № 824. Па якіх правілах будуць жыць прадаўцы і пакупнікі, разбіралася «Звязда».**

### ЗРАЗУМЕЛЫЯ ЦЭННІКІ

Прадавец абавязаны будзе ўказваць на цэнніках кошт ежы і напояў за кілаграм ці літр. Выключэнне — алкаголь, піва, яйкі, тавары ў наборы, прадукты вагой да 50 грамаў ці аб'ёмам да 50 мілілітраў. Такі падыход ужо прымяняецца ў многіх крамах. Гэта дазваляе пакупніку лепш арыентавацца ў коштах: вытворцы любяць змяніць фасоўку, каб падаражанне прадукту засталося незаўважаным. Правіла датычыцца таксама павільёнаў і інтэрнэт-крам. За парушэнне патрабаванняў — штраф да 10 базавых велічынь, пры паўторным парушэнні на працягу года — да 30 базавых.

СТАР. 4

Працяг тэмы

## ЖАРСЦІ ВАКОЛ ЯМЫ

**Крыху болей за месяц таму на старонках «Звязды» быў надрукаваны артыкул «Сметнік у горадзе», дзе размова ішла пра тое, як магілёўскі актывіст змагаецца супраць несанкцыянаванай звалкі на пустуючай тэрыторыі. Нагодай для напісання матэрыялу стаў зварот старшыні вулічкама № 5 Ленінскага раёна Магілёва, члена Савета тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання мікразоны № 4 Віталя Гардзеева.**

Тэрыторыя, на якой усё адбываецца, якраз уваходзіць у мікразону, якую ён «апякуе». Старшыня вулічкама паскардзіўся на ліцэй № 9, сцвярджаючы, што гісторыя з захаваннем смецця на нічыйнай зямлі паўтараецца не першы год. З гэтым пытаннем ён звяртаўся ў афіцыйныя ўстановы: апошні раз, мяркуючы па тых дакументах, якія ён прадставіў, гэта адбылося летась у лістападзе. Напрыклад, у афіцыйным адказе за подпісам кіраўніка адміністрацыі Ленінскага раёна Магілёва Віктара Лаўрыновіча размова ішла пра тое, што пры абследаванні прылеглай да ліцэя № 9 тэрыторыі сапраўды былі знойдзены бытавыя адходы і апалая лістота. Установе было вынесена прадпісанне прыбраць смецце. Сёлета Віталь Гардзееў запрасіў карэспандэнта «Звязды» паглядзець, як усё адбываецца на справе. Сапраўды, навучэнцы зносілі апалую лістоту ў выкапаную экскаватарам ямку. На ўскрайку яе таксама ляжала сучча разам са шпакоўняй. Усе прыкметы таго, што гісторыя паўтараецца?

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!
Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2019 года.

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

Парламенцкі дзённік

# ВЯСНА ЎЗІМКУ

## Беларуска-чэшскае міжпарламенцкае супрацоўніцтва набывае новае дыханне

**Учора ў Палаце прадстаўнікоў адбылася сустрэча намесніка старшыні ніжняй палаты беларускага парламента Баляслава ПІРШТУКА з чэшскай дэлегацыяй на чале з дэпутатам ніжняй палаты парламента Чэшскай Рэспублікі, кіраўніком чэшска-беларускай міжпарламенцкай групы дружбы Даніэлем ПАЎЛАСАМ.**

Баляслаў Пірштук з задавальненнем адзначыў, што адносіны з чэшскімі калегамі набываюць пазітыўны і дынамічны характар.

Віцэ-спікер ахарактарызаваў адносіны з чэшскімі дэпутатамі на міжнародных пляцоўках як добрыя і падзякаваў ім за падтрымку падчас пасяджэння Парламенцкай асамблеі АБСЕ, якое адбылося ў ліпені 2017 года ў Мінску.

Намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў закрануў таксама тэму садзейнічання развіццю эканамічных сувязяў паміж краінамі. «Беларускі бок вельмі зацікаўлены, каб раслі тэмпы гандлёва-эканамічнага і інавацыйнага супрацоўніцтва, — сказаў ён. — У нас з'явілася пэўная станоўчая дынаміка за апошнія два-тры гады, але раней паказчыкі былі больш важкімі, гэта значыць, што патэнцыял вышэйшы».

Баляслаў Пірштук выказаў задаволенасць ростам долі высокатэхналагічных паслуг ва ўдзельнай вазе ўзаемнага гандлю. Ён падкрэсліў зацікаўленасць у стварэнні сумесных вытворчасцяў, у супрацоўніцтве ў галіне энергетыкі, транспарту, прамысловасці, інфармацыйных тэхналогій, турызме.

«У наступным годзе ў канцы красавіка — пачатку мая мы правядзём канферэнцыю па падтрымцы праекта эканамічнага Шаўковага шляху, у якой, па папярэдніх даных, возьме ўдзел 23 дзяржавы. Запрашаю вашых калег, думаю, гэта будзе цікава, бо тэма прасоўвання ідэі «Адзін пояс — адзін шлях» дастаткова актуальная для многіх дзяржаў Еўропы, асабліва для бізнес-структур», — анансаваў віцэ-спікер.

Апроч іншага, парламентарыі абмеркавалі тэму міжрэгіянальнага супрацоўніцтва. Віцэ-спікер прапанаваў актывізаваць работу над сумеснымі дакументамі ў галіне навукі, тэхналогій, абароны інвестыцый, у сферы культуры мемарандумам паміж міністэрствамі юстыцыі двух краін.

У сваю чаргу Даніэль Паўлас выказаў упэўненасць, што гэта сустрэча, як і будучыя, закладваюць аснову добрых сувязяў паміж Чэхіяй і Беларуссю. «У сучасным свеце шмат праблем, але я перакананы, што супрацоўніцтва паміж народамі — залог паляпшэння сітуацыі, — сказаў ён. — У мінулым у нас было шмат агульных тэм, і пасля апошніх парламенцкіх выбараў у Чэхіі наш урад настроены на аднаўленне былых адносін».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Прэс-тур

# ГУЧАННЕ АРГАНА І СМАК ДЗЯЦІНСТВА

## Чым Віцебшчына здзіўляе расійскіх журналістаў

**Традыцыйны прэс-тур па Беларусі стартаваў экскурсіяй у найстаражытнейшы горад краіны Полацк і адзін з самых маладых — Наваполацк. Трыццаць хвілін язды і больш за 1000 гадоў гісторыі паміж двума гарадамі.**

У аўторак журналісты наведалі сем аб'ектаў Віцебшчыны — і гэта не самы насычаны дзень праграмы! Пачалося ўсё з экскурсіі ў Полацкім Спаса-Ефрасіннеўскім манастыры, у якім жывуць 125 насельніц. Рэстаўрацыяй Спаса-Праабражэнскага храма XII стагоддзя займаліся беларускія і расійскія спецыялісты.

Далей у праграме — дэгустацыя прадукцыі Полацкага малочнага камбіната, які ў суткі перапрацоўвае звыш 450 тон малака. На выбар для гасцей — кефір, ёгурты, дэсерты. Мая суседка па стале адзначыла якасць беларускага бутэляванага малака: «Смак сапраўднага, у нас не такое! Як у дзяцінстве!» Яе калега з Піцера, не адрываючыся ад дэгустацыі, каментаваў тэлевізійнікам, што ў горадзе на Няве беларуская прадукцыя на полках магазінаў не затрымліваецца.

На прэзентацыі прадукцыі кіраўніцтва прадпрыемства адказвала на пытанні гасцей. Журналісты даведаліся, што сёння экспарт у Расію складае 23 %, а ўвогуле на замежны рынак, які налічвае 14 краін свету, пастаўляецца да 50 % прадукцыі камбіната. Цікавіліся госці абмежаваннямі ўвозу прадукцыі ў Расію і тым, як праблему можна вырашыць.

**Асабліва натхняльным стаў невялікі канцэрт арганнай музыкі ў Сафійскім саборы Полацка. Не пакінула абыякавымі гасцей і сустрэча з «галавой, якая размаўляе» ў Полацкім дзяржаўным універсітэце.**

Далей госці накіраваліся ў Наваполацк. У горадзе жыве больш за 108 тысяч чалавек, амаль дзясятая частка насельніцтва — работнікі ААТ «Нафтан». Экскурсія на прадпрыемства папярэднічаў візіт у музей гісторыі і культуры горада. Расіян чакалі і першыя будаўнікі горада нафтавікоў — Пётр Таранда і Анатоль Гушча.



Фота БелТА.

Кульмінацыяй дня стаў візіт на нафтаперапрацоўчы завод «Нафтан», які ў лютым 2018-га адзначыў 55-годдзе. Пасля наведвання вытворчасці гасцей запрасілі на прэс-канферэнцыю з кіраўнікамі завода. На пытанне, якое вісела ў паветры, — як «Нафтан» рыхтуецца да падатковага манеўра Расіі? — дырэктар адказаў, што завод плануе завяршыць мадэрнізацыю прадпрыемства і настроены на пазітыўнае завяршэнне перагавораў аб кампенсацыі.

Пыталіся журналісты пра пастаўкі чорнага золата з Расіі. Прадстаўнікі «Нафтана» адзначылі, што яны збалансаваныя і ніякіх абмежаванняў не існуе.

**Марыя ДАДАЛКА,**
*Віцебская вобласць.*

### Уражанні

**Станіслаў ШАХАЎ, карэспандэнт інфармацыйнага агенцтва «Башінфарм» (Уфа):**

— Мне вельмі спадабалася архітэктура. Я — гісторык, таму люблю будынкі XVIII—XX стагоддзяў, разнастайныя раскопкі, з вялікай асалодай наведваў комплексы Полацка. Нават адыходзячы ад аўтобуса, калег, каб яшчэ крыху пафатаграфаваць. На мой погляд, на набярэжнай не хапае інфраструктуры, каб можна было поўнасцю ўбачыць велічны Сафійскі сабор. Я ў гэтым саборы ўпершыню заўважыў адметнасць, што можна было спусціцца ўніз і там пахадзіць. Яшчэ мне вельмі спадабалася акустыка пабудовы. Калі на інструментах гралі музыканты, я спецыяльна прайшоў па ўсім саборы, каб паслухаць гучанне.

**Ігар КАМІСАРЧЫК, RIA56.ru — рэгіянальнае інфармацыйнае агенцтва Арэнбургскай вобласці:**

— Я з Арэнбурга, наш горад таксама спецыялізуецца на нафтавай і газавай прамысловасці. Таму зацікавіў музей гісторыі Наваполацка. Паказана, як фактычна на пустым месцы вырас горад. Я гэта параўноўваю з маім Арэнбургам, гэта падобна на яго гісторыю. Вельмі цудоўна, што вы захоўваеце гэту спадчыну і памятаеце ветэранаў, якія калісьці будавалі горад.

Бізнес-партнёрства

## Бізнесмены з Карэліі абмяркоўваюць у Мінску сумесныя праекты

**У Беларускай гандлёва-прамысловай палаце на сустрэчы з дэлегацыяй Рэспублікі Карэлія шукалі магчымасці павышэння тавараабароту расійскага рэгіёна і нашай краіны.**

У карэльскую дэлегацыю ўвайшлі прадстаўнікі кампаній аграпрамысловага комплексу (рыбаводства, нарыхтоўка ягад, садавіны), харчовай, горназдабыўной і каменеапрацоўчай прамысловасці, дрэваапрацоўкі і іншых сфер.

У рамках візіту таксама адбылася сустрэча прадстаўнікоў Інжынернага цэнтра пажарнай робататэхнікі «Эфер» з горада Петразаводска з кіраўніцтвам МНС Беларусі.

— Цэнтр з'яўляецца аўтарам распрацовак у галіне робататэхнікі для пажаратушэння і датчыкаў вызначэння ачагоў узгарання. Гэтая прадукцыя не мае аналагаў у краінах СНД, і мы спадзяёмся на яе пастаўкі ў Беларусь, — сказаў **прэм'ер-міністр урада Рэспублікі Карэлія па пытаннях эканомікі Дзмітрый РАДЗІВОНАЎ.**

На працягу трох дзён дэлегацыя расійскага рэгіёна наведала некалькі прамысловых прадпрыемстваў, у тым ліку МАЗ, а таксама падпісала шэраг кантрактаў.

Сёння дэлегацыя Рэспублікі Карэлія сустракаецца з Прэзідэнтам Беларусі.

**Ганна ЮНЧЫЦ.**

Тры пытанні да ўлады

# Глуск мяняе імідж

**Старшыня Глускага райвыканкама Сцяпан ЧАЧУХА адказаў на пытанні «Звязды».**



**— Сцяпан Уладзіміравіч, раскажыце падрабязней пра тыя праекты, над якімі вы зараз працуеце. Наколькі сучаснымі стануць вашы галоўныя ўстановы адукацыі?**

— Гэта сацыяльна важныя аб'екты, і ўжо даўно наспела неабходнасць прывесці іх у належны стан. Сёлета ў студзені дзякуючы фінансавай падтрымцы Магілёўскага аблвыканкама здалі басейн, які функцыянуе пры гімназіі. Сёння яго наведваюць усе дзеткі, уключаючы санаторную школу-інтэрнат і Веснаўскі дом-інтэрнат, а па вечарах і ў выхадныя дні ўсе жыхары раёна. Адрамантавалі фасады гімназіі і першай школы. У гімназіі быў адноўлены пераход паміж басейнам і вучэбным корпусам, які знаходзіўся ў нездавальняючым тэхнічным стане. Зараз гэта галерэя стала ўпрыгажэннем гімназіі — тут шмат кветак і карцін. Выкладчыца гімназіі вельмі таленавітая мастачка.

Зараз за кошт сродкаў Сусветнага банка развіцця гімназія і сярэдняя школа № 2 зменяцца да непазнавальнасці. Прадугледжаны рамонт даху, замена вокнаў, дзвярэй. У спецыялізаваных кабінетах фізікі, інфарматыкі, хіміі будзе заменена тэхналагічнае абсталяванне. Па гімназіі ўсе падрыхтоўчыя стадыі ўжо пройдзены, вызначаны падрадчык, і на працягу сямі месяцаў яна павінна быць адрамантаваная. У планах на базе гімназіі стварыць пляцоўку для гандбола.

**— На базе кінатэатра «Арыён» плануецца стварыць шматфункцыянальны культурна-забаўляльны цэнтр. Што ён будзе з сябе ўяўляць?**

— Кінатэатр быў пабудаваны ў 80-я гады і ўжо маральна састарэў. Плюс наш Дом культуры, якому ўжо амаль 60 гадоў, не адпавядае патрабаванням часу. Мы вырашылі два гэтыя аб'екты аб'яднаць і зрабіць сучасны комплекс. Губернатар вобласці Уладзімір Даманеўскі нас у гэтым падтрымаў. Ужо выдзелены грошы на праектна-каштарысную дакументацыю. Вырашана перамясціць у гэты комплекс і загс, які знаходзіцца зараз у вёсцы Хваставічы ў не прыстасаваным для яго месцы — будынку сельсавета. У нас шмат таленавітых дзяцей, якія прывозяць з розных конкурсаў і фестываляў узнагароды. З імі працуюць таленавітыя харэографы Сняжана Каржнёва і Марына Рудабелец, іх выхаванцы паказваюць добрыя вынікі ў межах рэспублікі. Нядаўна вось прывезлі ўзнагароды за першыя месцы. Таму ў будынку з'явіцца і зала для харэаграфіі. Работнікам культуры наогул будзе вельмі зручна працаваць у новых умовах.

**— Вы ўзначальваеце раён не так даўно, з сакавіка гэтага года. Але гэта ўжо дастатковы час, каб падвесці нейкія вынікі.**

— Калі я толькі прыйшоў, пачынаў з добраўпарадкавання тэрыторыі. Паклалі асфальт па вуліцы Савецкай, на стан якой доўга скардзіліся людзі. Адрамантавалі дарогу каля цэнтральнага рынку: там была яма на яме. Раённую Дошку гонару ўсталявалі на плошчы перад райвыканкамам, каб людзі змаглі падысці і пагледзець, кім мы ганарымся. Раней яна знаходзілася ў фае райвыканкама і яе амаль ніхто не бачыў. Дзесьці агароджу паставілі, тратуарную дарожку паклалі. Адкрылі дзіцячую кавярню, каб жыхарам было куды з дзецьмі схадзіць. Пачалі будаваць 20-кватэрны дом. На вёсцы таксама наводзім парадак. Дахі, агароджы, фасады — трэба, каб усюды было прыгожа. Фінансаў на ўсе не хапае, трэба эканоміць і зарабляць грошы. Але мы бачым, у якім кірунку трэба развівацца.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# 7 тысяч порцый кавы і 55 тысяч літраў вады

## Мінскі чэмпіянат Еўропы па фігурным катанні ў лічбах

**Арганізатары знакавай падзеі, якую прыме Мінск з 21 па 27 студзеня 2019 года, абвясцілі шэраг цікавых лічбаў.**

Напрыклад, удзельнічаць у турніры будзе больш за 100 спартсменаў, сярод якіх самыя моцныя прадстаўнікі еўрапейскіх краін. Разам са спартсменамі прыедуць трэнеры і абслуговы персанал — усяго каля 500 чалавек. Спаборніцтвы будзе асвятляць каля 150 замежных журналістаў. Працаваць на мерапрыемствах будуць каля 200 валанцёраў, уключаючы замежных.

Аддзел падрыхтоўкі лёду будзе працаваць на пляцоўцы з 4 раніцы да 12 ночы, а вось спартсмены будуць трэніравацца і выступаць на лёдзе з 6 раніцы да 10 вечара. Плануецца, што за час афіцыйных трэніровак і спаборніцтваў фігурысты, іх персанал, а таксама персанал «Мінск-Арэны» вып'юць каля 7 тысяч порцый кавы.

Для чэмпіянату будуць выкарыстаны дзве лядовыя пляцоўкі — асноўная і трэніровачная арэны агульнай плошчай 3600 квадратных метраў. Для іх залівання спатрэбіцца 55 000 літраў падрыхтаванай з дапамогай спецыяльных фільтраў і рэагентаў вады. Каб надаць лёду патрэбны фонавы колер, будзе выкарыстана 600 кілаграмаў фарбы. Сімволіку чэмпіянату на лёд будуць на працягу трох дзён наносіць дзве брыгады па восем чалавек.

Цырымонія адкрыцця чэмпіянату адбудзецца 23 студзеня. Спаборніцтвы пройдуць з серады 23 студзеня па суботу 26 студзеня ўключна. 21 і 22 студзеня гледачы змогуць наведаць афіцыйныя трэніроўкі. Закрые чэмпіянат 27 студзеня гала-канцэрт з удзелам прызёраў спаборніцтваў.

Цікавая інфармацыя для тых, хто яшчэ сумняваецца, ці купляць білеты на чэмпіянат Еўропы. Білеты ў Мінску — самыя танныя за апошнія дзесяць гадоў. Абанемент на ўсе мерапрыемствы чэмпіянату каштуе ад 100 да 250 рублёў. Абанементы на асобныя дні (уключаючы трэніроўкі) — ад 5 да 50 рублёў.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

# ЖАРСЦІ ВАКОЛ ЯМЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Нядаўна рэдакцыя атрымала адказ на артыкул ад Магілёўскай гарадской інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя за подпісам яе старшыні Пятра Лапо, дзе гаворыцца, што законам аб адыходжанні з адходамі не забараняецца захаванне апалай лістоты ў санкцыянаваных для гэтага месцах для далейшага выкарыстання ў якасці кампосту. Гаворыцца і пра тое, што ліцэй № 9 мае дазвол на стварэнне кампоставай ямы на тэрыторыі свайго пладовага саду. «Атрыманы біягумус будзе выкарыстоўвацца для ўласных патрэб у якасці ўгнаення для падкормкі раслін», — сказана ў лісце.

Там жа пазначана, што «ў ходзе правядзення абследавання прылеглай да ліцэя тэрыторыі ўстаноўлена, што яна захламленая адходамі спажывання. Службовым асобам выданы рэкамендацыі на ліквідацыю выяўленых недахопаў, і яны выкананыя».

Яшчэ адзін ліст у рэдакцыю напісала метадыст ліцэя Надзея Лобах, якая з абурэннем сцвярджае, што ўсе факты ў артыкуле скажоныя. Маўляў, гэта ўсё здагадкі «змагара за чысціню Віталя Гардзеева». «Я працую ў ліцэі з 1982 года, люблю яго і ганаруся ім», — піша жанчына і дадае, што ўстанова заўсёды была толькі прыкладам для пераймання, што ніякага сметніка на яе тэрыторыі не было. Яе ліст і стаў нагодай для яшчэ аднаго візіту ў гэтую ўстанову.

Нездарма кажуць, што адной праўды няма, у кожнага яна свая. І пазіцыя старшыні вулічкама не супадае з пазіцыяй супрацоўнікаў ліцэя. Намеснік дырэктара ліцэя Ігар Васільчанка прадэманстраваў інструкцыю па абыходжанні з прыроднымі адходамі, якая сапраўды дазваляе зрабіць на тэрыторыі ліцэя кампаставую яму для ўласных патрэб. І яна, мяркуючы па інфармацыі, павінна знаходзіцца ў межах пладовага саду. Разам мы нават прыйшлі на тое самае месца, пра якое напісана ў артыкуле. Яма нікуды не знікла, праўда, лістоты ў ёй ужо не было. А вось наколькі само гэта месца законнае, устанавіць без спецыяліста немагчыма, бо агароджы паміж пустую-чай тэрыторыяй і тэрыторыяй ліцэя наогул няма (тут спасылаюцца на недахоп фінансаў).

А вось што шчыра кранула, дык гэта салідарнасць калектыву, людзей, аб'яднаных думкай, што іх установа найлепшая. «Бачыце, як шмат у нас дыпломаў», — прадэманстравалі яны спецыяльна адведзеную пад узнагароды сцяну. Праўда, усе дыпломы маюць дачыненне болей да навучальнага працэсу. А вось наконт добраўпарадкавання там нічога няма. Магчыма, у гэтым уся справа. Нездарма ж у лісце з прыродаахоўнай інспекцыі гаворыцца, што «пры праверцы назіраліся прыкметы захламлення тэрыторыі, на што і было ўказана кіраўніцтву ўстановы».

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## ДОЙЛІД СТАЎ ГАНАРОВЫМ ГРАМАДЗЯНІНАМ

**Знакаміты архітэктар Станіслаў Шабунеўскі, дзякуючы якому стварылася сённяшняе аблічча Гомеля, з 12 снежня лічыцца ганаровым грамадзянінам горада над Сожам. Такое рашэнне прыняў Гомельскі гарадскі савет дэпутатаў.**

Цяпер гамяльчане аддаюць заслужаную даніну павагі свайму знакамітаму земляку, які быў рэпрэсаваны ў 30-я і рэабілітаваны ў 1989 годзе. Па праектах Шабунеўскага ўзведзена большасць вядомых каменных будынкаў горада першай паловы XX стагоддзя. Мы расказвалі аб яго спадчыне ў адным з нумароў «Звязды» ў ліпені гэтага года.

2 снежня споўнілася 150 гадоў з дня нараджэння дойліда, а напярэдадні старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Дворнік у гутарцы з мэрам Гомеля Пятром Кірычэнкам агучыў ініцыятыву прысвоіць званне «Ганаровы грамадзянін Гомеля» Станіславу Шабунеўскаму. Кіраўніцтва горада падтрымала прапанову, унесла яе на разгляд сесіі гарсавета. А вось зараз падтрымалі і дэпутаты. Час задумацца і пра тое, каб памяць пра выдатнага архітэктара ў Гомелі захоўвалася і праз назву вуліцы ці помнік.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

## ПЕРШЫЯ БЕЛАРУСКІЯ МІКРААЎТОБУСЫ ПАЧАЛІ ЗБІРАЦЬ У БРЭСЦЕ

**На базе завода «Брэстмаш» пачалася зборка першых у нашай краіне пасажырскіх і грузавых мікрааўтобусаў. Гэта сумесны праект Мінскага аўтамабільнага завода, у структуру якога цяпер уваходзіць «Брэстмаш», і кітайскай кампаніі.**

Першыя сем машын ужо практычна гатовыя, паведамілі на заводзе. Мікрааўтобусы збіраюць нашы спецыялісты па айчынных тэхналогіях з кітайскіх камплектуючых. Выпускаюцца дзве мадэлі: пасажырскі аўтобус на 16 месцаў і грузавы фургон. Знешне новая машына падобная на «Мерседэс-Спрынтар», дызайн стварылі, абапіраючыся на густ спажыўцоў. У вытворчасці аўтобуса выкарыстоўваецца шасціступенчатая каробка перадач, рухавік на 150 конскіх сіл. Пры гэтых характарыстыках аўтамабіль лічыцца эканамічным. Інжынеры паклапаціліся і пра яго экалагічныя характарыстыкі, якія адпавядаюць еўрапейскім. Пакупнікі на першую партыю ўжо ёсць. Да канца года на заводзе плануюць выпусціць 50 машын, а ў перспектыве — да двух тысяч у год.

Новая вытворчасць, несумненна, стане імпульсам для брэсцкага прадпрыемства, якое апошнім часам знаходзілася ў складаным эканамічным становішчы.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

## У СТАЛІЦЫ «ШЭРЫХ» ТАКСІ ЎЖО ПРОЦЬМА

### Кампанія па кантролі за выкананнем заканадаўства ў сферы перавозкі пасажыраў аўтамабілямі таксі пачалася ў Мінску

**У гарадской падатковай інспекцыі адзначылі, што апошнім часам парушэнні ў гэтай галіне набываюць масавы характар. Так, пачасціліся выпадкі перавозкі пасажыраў не аўтамабілем-таксі, а праз паслугу арэнды аўтамабіля з кіроўцам. У апошнім выпадку ў перавозчыкаў адсутнічаюць касавыя апараты, сумешчаныя з таксаметрам. Замест іх выкарыстоўваюцца прылады, якія не адпавядаюць іх сферы прымянення.**

А за гэта ўжо можна і прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасці. «Акрамя таго, юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі абавязаны ўсталяваць і выкарыстоўваць плацежныя тэрміналы», — растлумачылі спецыялісты, звярнуўшы ўвагу пасажыраў, што ў адпаведнасці з законам "Аб абароне правоў спажыўцоў" выканаўца павінен своечасова даваць неабходную і дакладную інфармацыю аб прапанаваных таварах (работах, паслугах).

Калі вам прапануюць арэнду аўтамабіля з кіроўцам, то кліент павінен дакладна ведаць свае правы. У гэтым выпадку правілы аўтамабільных перавозак прадугледжваюць заключэнне да паездкі дагавора фрахтавання са складаннем нарад-заказа. Пры адсутнасці гэтых дакументаў у пасажыраў проста няма гарантый на абарону сваіх грамадзянскіх правоў.

Сяргей КУРКАЧ.

## ЗАЛЕЗЛА Ў КАШАЛЁК ДА 90-ГАДОВАЙ

**Зламысніцай была гараджанка 1990 года нараджэння, дырэктар аднаго з прыватных гандлёвых прадпрыемстваў.**

У міліцыю звярнулася пацярпелая пажылая жанчына з заявай аб крадзяжы 125 рублёў. Праваахоўнікі разам з экспертамі агледзелі жыллё пенсіянеркі, дзе знайшлі адбіткі. У іх ужо была версія аб падазраванай асобе, а сляды толькі пацвердзілі яе. Неўзабаве супрацоўнікі міліцыі затрымалі падазраваную ў крадзяжы мінчанку. Пад маркай продажу прыбора для кантролю ўцечкі газу яна пранікла ў кватэру да пенсіянеркі і скрала ў яе кашалёк, паведамілі ў ГУУС Мінгарвыканкама. Пры гэтым не забылася атрымаць грошы і за прададзены прыбор.

Сяргей РАСОЛЬКА.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Тэракт у Страсбургу

Позна ўвечары 11 снежня мужчына ўчыніў страляніну на калядным кірмашы ў цэнтры французскага Страсбурга. Злачынец быў узброены пісталетам і нажом.

Ахвярамі атакі сталі два чалавекі, 14 атрымалі раненні, шасцёра з іх знаходзяцца ў цяжкім стане. Як паведаміла Bangkok Post, у ліку загінулых аказаўся грамадзянін Тайланда. Сярод тых, хто атрымаў раненні, — італьянскі журналіст.

Стральба адбылася ў трох пунктах горада. Французскія ўлады разглядаюць тое, што адбылося, як тэракт. Падазраваным з'яўляецца 29-гадовы ўраджэнец Страсбурга па імені Шэрыф Ш. Звесткі пра яго знаходзяцца ў картатэцы Галоўнага ўпраўлення ўнутранай бяспекі, ён занесены ў спіс радыкальных ісламістаў і злачынцаў, якія пагражаюць дзяржаўнай бяспецы. Раней гэты грамадзянін ужо прыцягваўся да адказнасці за злачынствы ў Францыі і ў Германіі.

Згодна з інфармацыяй паліцыі, мужчыну павінны былі затрымаць у аўторак раніцай па падазрэнні ў датычнасці да замаху на забойства і рабаванні. У ходзе аперацыі былі затрыманы некалькі чалавек, аднак самога Шэрыфа дома не аказалася. Як паведаміў BFMTV, падчас вобыску ў яго ў кватэры знайшлі гранату.

У вышуку меркаванага тэрарыста прымаюць удзел 350 паліцэйскіх, 100 супрацоўнікаў судовай паліцыі, салдаты антытэрарыстычнай аперацыі «Сантынель», падраздзяленні аператыўнага рэагавання паліцыі Францыі. Таксама ў антытэрарыстычнай аперацыі задзейнічаны верталёты.

## Мэй заявіла, што будзе да апошняга змагацца супраць спроб адправіць яе ў адстаўку



Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Тэрэза Мэй заявіла, што будзе змагацца да апошняга супраць спроб зняць яе з пасады кіраўніка ўрада.

«Кіраўнік парламенцкага Камітэта-1922 Грэм Брэйдзі пацвердзіў, што атрымаў 48 лістоў парламентарыяў-кансерватараў, што запусціла працэдуру галасавання аб даверы да мяне ўнутры Кансерватыўнай партыі, — сказала Мэй. — Я буду змагацца супраць вотуму недаверу да апошняга». Брытанскі прэм'ер заявіла, што прымае выклік калег па Кансерватыўнай партыі.

Мэй дадала, што яе адстаўка рызыкуе затрымаць ці нават адмяніць працэс па выхадзе краіны са складу ЕС. «Замена лідара на чале Кансерватыўнай партыі зараз паставіць будучыню нашай краіны пад пагрозу, створыць нявызначанасць, калі мы з цяжкасцю можам сабе дазволіць гэта», — сказала Мэй, падкрэсліўшы, што гэта «не адпавядае нацыянальным інтарэсам».

## Bild: ХДС вывучае варыянты датэрміновай перадачы Крамп-Карэнбаўэр паўнамоцтваў канцлера

Германскі Хрысціянска-дэмакратычны саюз вывучае магчымасць таго, што Ангела Меркель перадасць паўнамоцтвы канцлера новаму лідару кансерватараў Аннегрэт Крамп-Карэнбаўэр да заканчэння гэтага легіслатурнага перыяду — 2021 года. Пра гэта паведаміла газета Bild са спасылкай на крыніцы ў кіраўніцтве ХДС.

У наступным годзе кіруючы альянс (блок ХДС/ХСС і СДПГ) пройдзе праз сур'ёзныя выпрабаванні: у маі пройдуць выбары ў Еўрапарламент, восенню — выбары ў трох усходнегерманскіх землях (Брандэнбург, Саксонія, Цюрынгія).

У кіраўніцтве ХДС разлічваюць, што Меркель перадасць Крамп-Карэнбаўэр пасаду кіраўніка ўрада самае позняе вясной 2020 года з тым, каб апошняя ўзмацніла свае пазіцыі і павяла кансерватараў на выбары 2021 года.

## ЛЮДЗІ СПРАВЫ

Узнагародзілі найлепшых кіраўнікоў харчовых прадпрыемстваў

**Найлепшых кіраўнікоў айчынных прадпрыемстваў харчовай прамысловасці абралі і ўзнагародзілі ў Мінску. Конкурс «Чалавек сваёй справы — 2018» у гэтай галіне ўпершыню правёў бізнес-часопіс «Дело (Восток+Запад)».**

Як падкрэсліў дырэктар выдавецтва «Беларусь» Сяргей Пешын, харчовая прамысловасць адна з важных галін эканомікі, якая гарантуе прадуктовую бяспеку. З больш чым сямі дзясяткаў прэтэндэнтаў на перамогу было абрана 22 лаўрэаты. Сярод іх топменеджары як вялікіх прадпрыемстваў, такіх як СААТ «Камунарка» (генеральны дырэктар Іван Данчанка), СП ААТ «Спартак» (генеральны дырэктар Алег Жыдкоў), ААТ «Мінск Крышталь» — кіруючая кампанія холдынга «Мінск Крышталь Груп» (генеральны дырэктар Станіслаў Іодзіс), ААТ «Гродзенскі мясакамбінат» (генеральны дырэктар Анатоль Грышук), ААТ «Бабуліна крынка» — кіруючая кампанія холдынга «Магілёўская малочная кампанія «Бабуліна крынка» (дырэктар Дзмітрый Главінскі), Глыбоцкі малочна-кансервавы камбінат (дырэктар Валерый Дулінскі), так і адносна невялікіх кампаній. Адметна, што большасць лаўрэатаў прадстаўлялі не сталіцу, а рэгіёны.

У цырымоніі ўзнагароджвання ўзялі ўдзел намеснік міністра інфармацыі Ігар Бузоўскі і першы намеснік старшыні канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Ігар Шустаў. Лаўрэатаў на конкурс вылучалі профільныя міністэрствы і ведамствы, а таксама бізнес-саюзы прадпрымальнікаў. А галоўнымі крытэрыямі адбору сталі асабістыя і кіраўніцкія якасці кандыдатаў, прафесіяналізм і эфектыўнасць працы.

**Алена КРАВЕЦ.**

# У электрычках — марожанае, у рэстаранах — дрэс-код

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Тавар вам павінны будуць прадаць па той цане, якая ўказана на цэнніку, а стравы ў кавярні ці рэстаране — за столькі, колькі прапісана ў меню (выключэнне — калі кошт зніzіўся). У сітуацыях, калі ў краме цэннікі не паспелі замяніць, а ў камп'ютар ужо загрузілі новую інфармацыю, пакупніку не давядзецца даплачваць.

Буйнагабарытныя тавары, цяжэйшыя за 25 кілаграмаў, прадавец абавязаны будзе па просьбе пакупніка бясплатна данесці да яго аўто, якое знаходзіцца на паркоўцы гандлёвага аб'екта ці побач з ім.

Калі прадукты прадаюцца на вагу, іх павінны будуць упакаваць бясплатна. Правіла не датычацца пакетаў, якія прапануюць на касе для ўсіх пакупак. А вось кантэйнеры для прыгожных і сушы могуць застацца платнымі. **Начальнік упраўлення арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Віялета БРАЗОЎСКАЯ** тлумачыць: кандытарскія вырабы, салата, катлеты і іншая кулінарная прадукцыя, якая вырабляецца ў самой краме, адносіцца да прадукцыі грамадскага харчавання, а таму новыя нормы па ўпакоўцы на такія тавары не распаўсюджваюцца.

## ПРАВІЛЫ ПАВОДЗІН У КАВЯРНЯХ

З лютага наступнага года кавярні, крамы і рынкі будуць самастойна вызначаць свой рэжым работы. Выключэнне — аб'екты, якія працуюць пасля 23 і да 7 гадзін: такі рэжым трэба ўзгадніць з гарадскім, раённым выканкамамі, мясцовай адміністрацыяй Мінска.

Рэстаратары маюць права ўстанаўліваць правілы паводзін у сваіх установах, у тым ліку і дрэс-код.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Зразумела, гэта не павінна ісці ўразрэз з агульнапрынятымі эстэтычнымі нормамі ці дыскрымінаваць людзей, — заўважае Віялета Бразоўская. — Інфармацыю аб правілах у сваіх установах рэстаратарам трэба змясціць публічна: яны маюць права выбраць любы даступны спосаб, каб давесці яе да наведвальнікаў.

## ПІРАТЭХНІКУ — ТОЛЬКІ ПАСЛЯ 16 ГАДОЎ

У цягніках міжнародных, міжрэгіянальных і рэгіянальных ліній бізнес-класа можна будзе гандляваць марожаным, кандытарскімі вырабамі, свежай агароднінай і садавінай, безалкагольнымі напоямі — пры належных умовах захоўвання і продажу прадуктаў.

Пашырыцца пералік месцаў продажу тэхнічна складаных тавараў бытавога прызначэння, экземпляраў аўдыявізуальных твораў, вырабаў з серабра, аўтамабіляў, піратэхнічных вырабаў бытавога прызначэння I і II класаў небяспекі. Напрыклад, планшэты і фотаапараты дазволяць рэалізоўваць не толькі ў павільёнах і крамах, але і пры разносным гандлі. Галоўнае, каб пры гэтым прадавец мог прадставіць на праверку камплектнасць тавару і прадэманстраваць яго працаздольнасць. Упрыгажэнні з серабра, бенгальскія свечкі і петарды можна будзе купіць у кіёсках і «астраўках» у гандлёвых цэнтрах.

Непаўналетнім да 18 гадоў забароняць прадаваць пнеўматычныя пісталеты, рэвальверы і вінтоўкі, лукі і арбалеты, якія канструкцыйна падобныя да зброі, а тым, каму няма 16 гадоў, — піратэхнічныя вырабы бытавога прызначэння.

У цэлым пералік правіл для сферы гандлю і грамадскага харчавання скарацілі на 20 працэнтаў. Прыбралі патрабаванні да касавых апаратаў, патрабаванні тэхнічных рэгламентаў, нормы, якія дублююцца іншымі дакументамі. На змены ў заканадаўстве паўплывалі Дэкрэт № 7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва» і Указ № 345 «Аб развіцці гандлю, грамадскага харчавання, бытавога абслугоўвання», якія ўвялі пэўныя паслабленні для вядзення бізнесу.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

**Тым часам**

## Умовы для свабоднай канкурэнцыі

Цяпер разглядаюцца змены ў закон «Аб дзяржаўным рэгуляванні гандлю і грамадскага харчавання ў Рэспубліцы Беларусь». З цікавых момантаў, якія ёсць у праекце, — норма аб тым, што буйныя сеткі крам будуць самастойна разлічваць долю ў аб'ёме рознічнага тавараабароту харчовых прадуктаў у межах Мінска, абласных цэнтраў, раёнаў, дзе знаходзяцца іх аб'екты. Калі доля складзе больш за 20 працэнтаў, суб'ект гандлю абавязаны будзе прыпыніць пашырэнне сваёй сеткі.

Шэраг нормаў з заканадаўства прапануецца выключыць. Напрыклад, адміністрацыя абавязак распрацоўваць схемы размяшчэння стацыянарных аб'ектаў гандлю і грамадскага харчавання і неабходнасць ствараць крамы і кавярні ў адпаведнасці з такімі планамі. Праз гэта адкрываць новыя рэстараны стане прасцей, будуць умовы для развіцця свабоднай канкурэнцыі.

Магчыма, выключаць артыкул пра дзяржаўныя сацыяльныя стандарты ў галіне гандлю і грамадскага харчавання. Дасягнутыя ў канцы мінулага года нарматывы сведчаць аб дастатковым узроўні развіцця інфраструктуры. Далей паваліваць стандарт забяспечанасці гандлёвымі плошчамі і месцамі грамадскага харчавання немэтазгодна. Тым больш з развіццём інтэрнэту ўсё больш людзей будзе аддаваць перавагу анлайн-пакупкам.

Праблемы з недахопам крам ёсць у сельскай мясцовасці, але іх не вырашыш дырэктыўным устанаўленнем нарматываў. Каб прыцягнуць бізнес у вёску, патрэбны іншыя меры — у першую чаргу падатковыя і іншыя льготы, лічаць у МАРГ. Напрыклад, прэферэнцыі, прапісаныя ва ўказе № 345. За дзевяць месяцаў гэтага года імі скарысталіся 228 юрасоб і 828 індывідуальных прадпрымальнікаў. На вёсцы адкрылася 218 аб'ектаў гандлю і 26 — грамадскага харчавання.

# ГАНДЛЯВАЦЬ ХАРЧОВЫМІ ПРАДУКТАМІ СТАНЕ ПРАСЦЕЙ?

**У Беларусі змяніліся санітарныя нормы і правілы гандлю харчовымі прадуктамі на рынках. Зараз яны складаюцца з 36 пунктаў замест ранейшых 131. Адтуль, у прыватнасці, цалкам знік раздзел, які датычыўся асабістай гігіены прадаўцоў і іншых работнікаў, якія ўдзельнічаюць у абароце прадукцыі на рынку. Увогуле, на першы погляд, правілы істотна спрасціліся. Аднак, як аказалася, гэта зусім не азначае, што многія патрабаванні адменены.**

З чым звязаныя змены ў санітарных нормах і правілах, якія дзейнічалі з 2012 года, а таксама ці азначае адсутнасць некаторых пунктаў у новым дакуменце іх адмену, «Звяздзе» растлумачыла **намеснік галоўнага ўрача Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Іна КАНДРЭСКУЛ.**

— Актуалізацыя тэхнічных нарматыўна-прававых дакументаў органамі дзяржаўнага санітарнага кантролю робіцца сёння з акцэнтам на давер суб'екту гаспадарання ў плане гарантавання бяспекі здароўя насельніцтва. І калі раней мы дэталёва прапісвалі ўсе патрабаванні да аб'ектаў, вытворчасці, то зараз даём права самастойна выбіраць, якімі спосабамі будзе гарантавацца такая бяспека. Пры гэтым Дэкрэт № 7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва» ўстанаўлівае агульныя санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні, у тым ліку да абсталявання і ўтрымання рынкаў пры абароце харчовай прадукцыі. І новая рэдакцыя санітарных правілаў, якія зацверджаны пастановай Міністэрства аховы здароўя № 80, распрацавана з улікам ужо зацверджаных патрабаванняў, якія ёсць у дэкрэце.

Новыя нормы датычацца стану тэрыторыі і памяшканняў, асвятлення, захоўвання і ўпакоўкі прадуктаў, умоў эксплуатацыі туалетаў, барацьбы з цвіллю, шкоднымі насякомымі і грызунамі, а таксама вывазу смецця. Што датычыцца тэрыторыі рынкаў, то старыя правілы рэгулявалі колькасць уездаў, падзел на зоны і нават тое, як павінны размяшчацца кантэйнеры для смецця — не больш за 20 метраў адзін ад аднаго. У новых правілах гэтых пунктаў няма. Прапісана, што ачыстка ўрнаў для смецця павінна праводзіцца штодзённа па меры напаўнення. А вываз харчовых адходаў з тэрыторыі рынку мусіць ажыццяўляцца па меры напаўнення ёмістасцяў. Раней разгрузка прадукцыі забаранялася непасрэдна на зямлю, зараз такога патрабавання ў дакуменце няма. Зніклі з новай рэдакцыі і пункты пра вентыляцыю памяшканняў, якая паводле ранейшых правілаў забяспечвалася прытокава-выцяжнымі механічнымі сістэмамі, што не павінны ствараць шуму, узровень якога вышэйшы за дапушчальны памер.

У новай рэдакцыі прапісана, што не дапускаецца наяўнасць цвілі на падлозе, сценах і столі памяшканняў. Астатнія патрабаванні, якія датычыліся санітарных нормаў утрымання сцен, падлогі і столі, з дакумента выдалілі. Згодна з новай рэдакцыяй, туалеты не павінны мець выхадаў у памяшканні рынку, дзе ажыццяўляецца гандаль ці знаходзіцца прадукцыя.

Змагацца са шкоднымі насякомымі, грызунамі, а таксама птушкамі ў памяшканнях па-ранейшаму трэба, а вось упамінання пра недапушчэнне туды жывёл у новым дакументе няма. Згодна са старымі правіламі, рэалізацыя свежай садавіны і агародніны ў халодную пару года (пры тэмпературы ніжэй 0) забаранялася на адкрытых гандлёвых месцах. Такога патрабавання ў новых нормах няма. Дазваляецца рэалізацыя агародніны, зеляніны, свежых грыбоў, фруктаў на адкрытых гандлёвых месцах (са сталоў, кошыкаў, бочак, скрыняў, мяшкоў, а таксама з аўтамабільнага транспарту).

Сельскагаспадарчая прадукцыя, выробленая грамадзянамі на зямельных участках для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі, садаводства, агародніцтва, можа рэалізоўвацца на рынку пасля правядзення лабараторных даследаванняў і заключэння лабараторыі ветэрынарна-санітарнай экспертызы рынку аб адпаведнай якасці. А асобы, якія рэалізуюць гэту прадукцыю, павінны праходзіць рэнтгенфлюараграфічнае даследаванне.

Адзначым, што новы дакумент, які быў апублікаваны 6 снежня, уступіць у сілу праз 15 дзён з моманту абнародавання.

**Алена КРАВЕЦ.**

Сямейная газета

Выпуск № 23 (114)

# УСЕ МЫ ЎМЕЕМ РОХКАЦЬ

Падслухала днямі ў грамадскім транспарце дыялог:

— Мама, хутка Новы год! А чый будзе наступны год?

— Свінні.

— Гэта значыць, дрэнны?

— Ну, чаму адразу дрэнны...

— Бо пройдзе па-свінску!

Ужо дома пачалі разам са старэйшай дачкой успамінаць: а праўда, свіння ў дзіцячым уяўленні — гэта станоўчы ці адмоўны персанаж? Якія ёсць казкі, вершы, песенькі, мультфільмы, дзе парася — герой?

Успомнілі перадусім «Трох парсючкоў». Гісторыя, скажам так, спрэчная: адзін парсюк кемлівы, двое другіх легкадумныя, але калі паставіць на іх месца, напрыклад, зайцоў — хіба мараль зменіцца?

Дачка ўспомніла пра свінку Пепу — мультыплікацыйная суперзорка брытанскага тэлебачання «нарадзілася» амаль 15 гадоў таму і разам са сваім свінскім сямействам заваявала больш чым 180 краін дзякуючы лёгкаму характару, невычарпальнаму аптымізму і адсутнасці абавязковай павучальнай маралі ў кожнай серыі мультфільма. А вось пра лялечнага Хрушу, актыўнага неслуха, які ўвесь час трапляе ў розныя гісторыі і ўсё ніяк не набярэцца розуму, нагадала ўжо я — дачка належыць да таго пакалення, для якога вечаровы прагляд перадачы «Добрай ночы, малыя!» даўно не з'яўляецца абавязковым рытуалам. Потым прыйшоў на памяць маленькі сябар Віні-Пуха Пятачок — вырашылі, што ён добры і амаль не баязлівы, далей — дружалюбны і шчыры Фунцік, які не стаў падманваць дзяцей і збіраць з іх грошы «на домікі для бяздомных парасят», далей ружовая модніца Нюша са «Смяшарыкаў», і пайшло-паехала...

І ведаеце, што? Аказваецца, гэта зацягвае — не звяртаючыся да ўсёмагутнага Гугла, з дапамогай толькі ўласнай памяці ды, на крайні выпадак, падказак сяброў пералічваць пэўных персанажаў (паспрабуйце самі!). Атрымліваецца і зарадка для мозга, і перадсвяточная настройка. Хіба што выхаваўчы момант цяпер пакутуе: толькі надумаеш крытыкаваць малую, прыгаворваючы «хіба ты свінка?», як яна ў адказ хітра прыжмурваецца і гаворыць, што зусім не супраць пабыць Нюшай ці свінкай-супергероем (як высветлілася, і такая ёсць!). І прысутнічае ў такім падыходзе нейкая сярмяжная праўда, бо літаратурныя, кіношныя, мультыплікацыйныя свінні — яны, прабачце, як людзі, якія гэтых персанажаў прыдумалі і надзялілі пэўнымі характарыстыкамі. І, у сваю чаргу, у пэўным сэнсе — усе мы трошачкі свінкі і парсючкі.

Таму, рыхтуючыся належным чынам сустрэць 2019-ы, адкажыце сабе шчыра: вы — які персанаж? Мілае і дружалюбнае парася Бэйб, якое запусціла сусветную моду на сімпатычных міні-пігаў, агрэсіўны міфічны Калядонскі вяпрук або наогул прыдуманы псеўданавукоўцам Свінтус грандыёзус? Магчыма, якраз ад гэтага залежыць, як пройдзе для вас наступны год.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Традыцыйныя каштоўнасці

# ЗАПРАСІЦЕ Ў ГОСЦІ «САФІЮ»

## Сталічныя студэнты вучаць старшакласнікаў разважаць пра сэнс жыцця, каханне і сям'ю




**Прагучыць банальна, але некаторыя бацькі не маюць часу ці не лічаць неабходным размаўляць са сваімі дзецьмі-падлеткамі на такія сур'ёзныя тэмы. У многіх школьнікаў перад вачамі стаіць прыклад няўдалых адносін маці з татам. Пры такім раскладзе хлопцы і дзяўчаты перастаюць верыць, што ў наш час можна з першай спробы пабудаваць шчаслівую сям'ю. Праект «Сафія» — сумесная ініцыятыва Белдзяржуніверсітэта і Беларускага саюза жанчын. Ён дапамагае моладзі не страціць веру ў сябе і іншых, раскрывае сутнасць трывалых адносін паміж людзьмі.**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*

Цікавы досвед

# ЯК У ДЭКРЭЦЕ БЯСПЛАТНА АТРЫМАЦЬ ПРАФЕСІЮ

**Курсы ад службы занятасці могуць праходзіць не толькі тыя, хто афіцыйна зарэгістраваны беспрацоўным, але і мамы, якія даглядаюць дзіця да трох гадоў. Жанчынам у дэкрэце прапаноўваюць бясплатна асвойваць прафесіі цырульніка, лагіста, кухара, прадаўца. Наколькі перападрыхтоўка павышае шансы знайсці работу, мы даведаліся з першых вуснаў.**



Марыя ВІСКУШЭНКА разам з сям'ёй.

## На работу — у салон прыгажосці

**Марыя Віскушэнка** — мама двух дачок. Да дэкрэту працавала бухгалтарам. Прызнаецца: гэта прафесія зусім не па ёй. Школьніцай Марыя хацела паступаць у тэхналагічны каледж на спецыяльнасць «цырульніцкае мастацтва, дэкаратыўная касметыка». Але ў той год быў вялікі конкурс — больш за 20 чалавек на месца, — і дзяўчына «праляцела». Пайшла на эканаміста, каб атрымаць хоць якую адукацыю.

Уладкоўвацца бухгалтарам зноў пасля дэкрэту не хацелася. Запісацца на курсы па манікюры ад цэнтра занятасці, каб здзейсніць сваю даўнюю мару, Марыі параіла яе майстар.

— Мяне прывабіла тое, што на гэтых курсах даецца пасведчанне дзяржаўнага ўзору і прысвойваецца пачатковы разрад — трэці. Плюс з такой прафесіі можна працаваць на сябе — напрыклад, здымаць кабінет, — дзеліцца жанчына.

Заняткі цягнуліся два з палавай месяцы. Вучэбны дзень — васьмігадзінны. Малодшая дачка тым часам была ў дзіцячым садку.

— Мне лёгка давалася навучанне, — заўважае Марыя, якая некалі займалася ў мастацкай школе. — Залік па роспісе на пазногцях здала без цяжкасцяў. А па прадмеце «пластычная анатомія» ў мяне адзінай у групе была «дзясятка».

Месца для практыкі навучэнцы шукалі самі. «Нам сказалі: у салоны можаце нават не спрабаваць уладкавацца — толькі ў цырульні. А я рызыкнула і пайшла прасіцца на практыку ў салон. Мяне ўзялі — і цяпер там працую. Пытанняў наконт таго, што я маці малых дзяцей, і, магчыма, давядзецца часта браць бальнічныя, не было. Тым больш на рабоце не трэба сядзець з ранку да вечара, прыходзіш на той час, калі запісаліся кліенты».

Марыя адзначае, што на курсах даюць добрую базу па апрацоўцы пазногцяў («а гэта самае асноўнае, бо на недагледжаных руках ніякае пакрыццё глядзецца не будзе»). Але пасля ўсё роўна трэба павышаць кваліфікацыю: асвойваць нанясенне таго ж гель-лаку, які зараз у модзе.

На новым месцы жанчына працуе каля месяца. Кажа, што абсалютна не расчаравалася: «Мне заўсёды падабалася наводзіць прыгажосць. Планую яшчэ навучыцца рабіць прычоскі і макіяж. Хочацца, каб усё было ідэальна, каб кожная жанчына выходзіла ад мяне лялечкай».

*(Заканчэнне на 7-й стар. «СГ».)*

Сацыяльная кансультацыя

## ВЫ ПЫТАЛІСЯ ПРА ДОМ-ІНТЭРНАТ ДЛЯ САСТАРЭЛЫХ?

**У некаторых выпадках у чалавека няма іншага выйсця, акрамя як пасяліцца ў доме-інтэрнаце для састарэлых і інвалідаў. Хто туды можа трапіць і на якіх умовах? Адказвае намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Аляксандр РУМАК.**

### Хто мае права на сацыяльнае абслугоўванне ў дамах-інтэрнатах для састарэлых і інвалідаў?

Пасяленне ў дамы-інтэрнаты для састарэлых і інвалідаў ажыццяўляецца і сацыяльныя паслугі ў іх могуць аказвацца грамадзянам Беларусі, замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, якія дасягнулі ўзросту, што дае права на пенсію па ўзросце на агульных падставах, з'яўляюцца інвалідамі І і ІІ групы, маюць патрэбу ў пастаянным староннім доглядзе або староннай дапамозе, бытавым абслугоўванні і медыцынскай дапамозе.

Для адзінокіх інвалідаў І і ІІ групы і грамадзян, якія дасягнулі 65-гадовага ўзросту, пражыванне ў дамах-інтэрнатах і сацабслугоўванне ў іх бясплатнае. Названым грамадзянам пенсія выплачваецца ў памеры 10 %, але не менш за 20 % мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце. Удзельнікам і інвалідам Вялікай Айчыннай вайны пенсіі выплачваюцца ў памеры не менш за 25 % і не менш за 20 % мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце. Астатняя частка пенсіі застаецца ў распараджэнні Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва.

### У якіх выпадках трэба плаціць за пражыванне ў доме-інтэрнаце для састарэлых і інвалідаў агульнага тыпу?

Існуе некалькі формаў пражывання ў дамах-інтэрнатах. Інваліды І і ІІ групы і адзінокія пажылыя грамадзяне, якія не маюць працаздольных членаў сям'і, абавязаных па законе іх утрымліваць, пасяляюцца ў дамы-інтэрнаты на дзяржаўнае забеспячэнне.

На платных умовах пасяляюцца наступныя катэгорыі грамадзян:

— якія маюць асоб, абавязаных па закону іх утрымліваць;

— якія атрымліваюць пенсію з іншых дзяржаў у адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі (пагадненнямі), заключанымі Рэспублікай Беларусь;

— якія не дасягнулі ўзросту 65 гадоў, за выключэннем інвалідаў І і ІІ групы;

— тыя, чыё жыллё, што належыць ім на праве ўласнасці, было адчужанае па дагаворах дарэння, куплі-продажу на працягу 5 гадоў, што папярэднічаюць дню падачы заявы аб пасяленні ў доме-інтэрнаце, або пасля падачы такой заявы і да дня пасялення, а таксама пры адчужэнні жылля ці здачы яго па дагаворы найму жылога памяшкання падчас пражывання грамадзян у стацыянарнай установе;

— тыя, хто пасяляецца ў аддзяленне павышанай камфортнасці;

— пры кароткатэрміновым пражыванні.

Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.

# ЗАПРАСІЦЕ Ў ГОСЦІ «САФІЮ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Пасля пятага-шостага ўрока дзесяцікласнікі сярэдняй школы № 204 Мінска збегчы дадому не спяшаюцца. Сёння іх чакаюць яшчэ адны заняткі. Ніякіх складаназлучаных сказаў, задач па геаметрыі і экскурсаў у гісторыю Вялікай Айчыннай вайны. Тэма ўрока казытлівая, але тым і цікавая: гаворка пойдзе пра каханне і закаханасць, і весці яе будзе другакурсніца механіка-матэматычнага факультэта БДУ Ульяна Салавей.



«Якая яна, ідэальная дзяўчына вачыма старшакласнікаў?»

Першыя хвіліны хлопчыкі пасмейваюцца, дзяўчаты чырванеюць. Але паступова ўцягваюцца і пачынаюць здзіўляць свайго лектара надзвычай дарослымі думкамі-высновамі. Не пазнаць хулігана-троечніка, які пускаецца ў дыскусію з выдатніцай пра тое, дзе знаходзіцца мяжа паміж ахвярнасцю і звычайнымі пакутамі.

— Адносіны паміж мужчынам і жанчынай «кранаюць за жывое» амаль усіх старшакласнікаў і студэнтаў. Калі шчыра, то спачатку мне і самой вельмі хацелася разабрацца ў гэтых паняццях. Да знаёмства з «Сафіяй» я асабліва не задумвалася пра тое, што ёсць розніца паміж каханнем і закаханасцю. Затое вельмі часта даводзілася чуць як пра існаванне фантастычнага «кахання з першага погляда», так і пра яго адсутнасць. Мне патрэбна было лагічнае тлумачэнне, заснаванае на рэальных гісторыях людзей, што жывуць сярод нас, — расказвае Ульяна пасля заняткаў.

Яна і яшчэ з дзясятак такіх жа студэнтаў — валанцёры «Сафіі».

— Назва сімвалічная. Сафія ў перакладзе з грэчаскай мовы — мудрасць. Да таго ж, у хрысціян Сафіяй звалі маці Веры, Надзеі і Любові. Сёння яны адносяцца да ліку святых, — расказвае заснавальніца ініцыятывы — **кіраўнік аддзела маладзёжных праграм і праектаў упраўлення выхаваўчай работы БДУ, кіраўнік маладзёжнага крыла БСЖ Наталля ЯРАШЭВІЧ.** — Ідэю праекта падказала само жыццё. Сям'я, каханне, сяброўства — здаецца, словы, вядомыя ўсім, і тлумачэння не патрабуюць. Аднак, як паказваюць апошнія апытанні беларускіх студэнтаў, далёка не ўсе маладыя людзі маюць канкрэтныя і трывалыя ўяўленні на гэты конт. Высветлілася, што прыкладна трэцяя частка з 400 апытаных хлопцаў і дзяўчат з Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта лічаць неабходнай афіцыйную рэгістрацыю шлюбу. Што да астатніх — яны не могуць знайсці прычыну для гэтага, таму згодныя на сужыццё. «Бо так прасцей». Чаму студэнты так разважаюць? Магчыма, з-за таго, што бачаць навокал шмат прыкладаў нешчаслівых шлюбаў, ці, магчыма, гэта яшчэ адзін вынік глабалізацыі. Падобныя погляды ніколі не былі ўласцівыя беларусам. Яны літаральна навязваюцца нам праз інтэрнэт. Дастаткова зазірнуць у папулярныя маладзёжныя анлайн-СМІ. Там убачым тэксты пра свабодныя ці аднаполыя адносіны, пра мэтанакіраваную адмову ад дзяцей і таму падобнае. Такія гісторыі падаюцца як нешта эксклюзіўнае і моднае. Вось хлопцы і дзяўчаты і пачынаюць думаць, што гэта норма.

Камусьці можа падацца дзіўным, чаму заняткі для школьнікаў праводзяць студэнты. Яны ж самі толькі робяць першыя крокі ў дарослым жыцці. За іх плячыма, як правіла, яшчэ няма досведу стварэння сям'і. Многія толькі пачынаюць будаваць сур'ёзныя адносіны з супрацьлеглым полам. Аднак у Наталлі на гэты конт іншыя думкі:

— Цяперашнія старшакласнікі зусім не такія, якія былі яшчэ дзесяць-пятнаццаць гадоў таму. Незвычайна самастойныя і цікаўныя ў пытаннях, якія закранаюць іх асабістае жыццё. Для многіх з іх словы дарослых — настаўнікаў і бацькоў — не аўтарытэт. Хлопцам і дзяўчатам важна самастойна дакапацца да ісціны, яны не саромеюцца выказваць уласнае меркаванне, нават калі яно ідзе ўразрэз з думкамі астатніх. Таму наша задача перш за ўсё — падзяліцца са школьнікамі інфармацыяй, а пасля выклікаць іх на дыялог. Важна, каб падлеткі самі ў працэсе размовы ці гульні прыйшлі да пэўных высноў. Толькі ў такім выпадку намаганні не прападуць дарма.

Пераемнасць пакаленняў — гэта аснова, на якой трымаецца «Сафія». Гэта яшчэ адна з прычын, па якой са школьнікамі працуюць студэнты. Яны быццам сувязныя паміж дарослымі і падлеткамі. Перш чым ісці да сваёй аўдыторыі, хлопцы і дзяўчаты прайшлі падрыхтоўку ў прафесіянальных лектараў. У якасці экспертаў для студэнтаў выступаюць куратар асветніцкага праекта «За жыццё, мараль і сямейныя каштоўнасці» Алена Ярашэвіч, журналіст і радыёвядучая, кіраўнік фестывалю сацыяльнай рэкламы «Далонька» Алена Есіна, рэжысёр, акцёр, музыкант Віталь Любецкі, а таксама святары, псіхолагі, выкладчыкі. Запрошаныя госці закранаюць надзвычай цікавыя тэмы. Напрыклад, намеснік дырэктара Студэнцкага гарадка Белдзяржуніверсітэта Дзмітрый Мікулка з вышыні ўласнага досведу разважаў пра тое, ці варта рабіць выбар паміж сям'ёй і кар'ерай. Спявак, выкладчык БДУ і навасвечаны тата Дзмітрый Нікановіч разам з жонкай Кацярынай расказаў пра складанасці, з якімі можа сутыкнуцца маладая сям'я.

— У нашай краіне шмат прыкладаў цудоўных сем'яў і неабыякавых людзей, гатовых падзяліцца сваім досведам, — упэўнена студэнтка чацвёртага курса факультэта журналістыкі Надзея Мархель. — Мне на пару з Цімафеем Бекішавым дасталася тэма «Мужнасць/Жаноцкасць». Працуючы над ёй, давялося пералапаціць шмат літаратуры, пераглядзець дзясяткі відэа і пазнаёміцца з многімі экспертамі ў гэтым пытанні. Каб спачатку выхаваць адпаведныя якасці ў сабе і толькі пасля ісці з імі да школьнікаў. Невялікая розніца ва ўзросце дазваляе гутарыць быць больш адкрытай.

Весткі пра «Сафію» разлятаюцца з хуткасцю святла. Праект яшчэ не адзначыў і год існавання, аднак ужо прайшоў шлях ад унутрыўніверсітэцкай да рэспубліканскай ініцыятывы. «Сафійскія» сустрэчы на найбліжэйшы час запланаваны ў трох сталічных школах і каледжы. Акрамя таго, чакаюць хлопцаў і дзяўчат у Бабруйску: там распачалі аналагічную ініцыятыву і просяць падзяліцца напрацоўкамі. Дзякуючы сацыяльным сеткам аб праекце БДУ ведаюць нават у далёкім Арэнбургу. Выкладчыца мясцовага ўніверсітэта таксама арганізоўвае семінары на тэмы сямейных каштоўнасцяў і хоча пазнаёміцца са сваімі беларускімі «калегамі». Валанцёрскі абмен прызначаны на люты 2019-га.

**Ганна КУРАК.**

**ООО «Центр Белинвентаризация»**
**г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1**

✓ Раздел и установление порядка пользования земельным участком
✓ Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения
✓ Пересчет долей в связи с изменением капитального строения

**Извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества ОАО «ДОРОЖНО-СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 2, г. ГОМЕЛЬ», тел. 8 (0232) 33 84 69**

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение (здание служебно-бытового корпуса) с инв. № 340/С-291068, площадью 717,1 кв. м (составные части и принадлежности: тамбур, подвал), расположенное по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, Жмуровский с/с, 2А. *Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 324550100001010654 площадью 0,0721 га* | 63 072,00 | 6 307,20 |
| Срок подачи заявления | **По 22 декабря 2018 г**. в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 | | |
| Дата, время, место проведения аукциона | **27 декабря 2018 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 | | |
| Номер р/с для перечисления задатка | Р/с BY71BPSB30121783390109330000 в РД № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 13.12.2018 г. | | |
| Условия продажи | Объекты продаются в собственность. Шаг аукционных торгов – 5 %, заключить договор купли-продажи в течение 20 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. Победителю аукциона предоставляется рассрочка платежа на 6 (шесть) месяцев равными долями с момента подписания договора купли-продажи. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 24.01.2018 г. | | |

**Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 75 06 62, (029) 341 15 45**

Далікатная тэма

# СКЛАДАНАСЦІ ПЕРАХОДУ

## Як знайсці агульную мову з падлеткам?

**Пераходны ўзрост не толькі выпрабоўвае на трываласць самога падлетка і яго бацькоў, але і экзаменуе адносіны паміж імі. Як за гэты час не аддаліцца, а стаць яшчэ бліжэй, што варта ведаць, каб не «ўпусціць» дзіця, расказала псіхолаг Гарадскога дзіцячага клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Галіна СТАНЧЫК.**



***— Галіна Антонаўна, як прияўляецца падлеткавы ўзрост? Што адбываецца ў пераходны перыяд з дзецьмі?***

— Калі ў крызісах іншых узростаў яшчэ сумняваюцца, то пра гэты вядома з даўніх часоў. Шэкспір, напрыклад, казаў, што было б добра, калі б яны заснулі гадоў у 16 (на тыя часы), а ў 20 прачнуліся — і не нарабілі б глупстваў. Многім бацькам таксама хочацца зажмурыцца і расплюшчыць вочы тады, калі гэты перыяд пройдзе, дзіця стане спакойным і з ім можна будзе дамовіцца. Але пераходны ўзрост варта не пераждаць, зажмурыўшы вочы, а пражыць. Бо гэта адзін з самых важных этапаў у развіцці, які шмат дае на будучае. Для бацькоў гэта складаны час, але ёсць меркаванне, што па-сапраўднаму дарослы той чалавек, хто пражыў сталенне сваіх дзяцей.

Падлеткі выдатна адчуваюць нашы слабыя месцы і падсвядома б'юць менавіта туды, дзе нам вельмі балюча. Часам бацькам здаецца, што робіцца гэта наўмысна, што гэта такая гульня «дастань бацькоў». Варта разумець, што нашым дзецям у пераходным узросце вельмі складана, яны, як Русалачка, якой кожны крок даецца з болем. Адна з прыкмет пераходнага ўзросту — эмацыянальная няўстойлівасць. Яна абумоўлена зменамі мозга: непатрэбныя нейронныя сувязі адміраюць, актывізуюцца і замацоўваюцца іншыя. Таксама бацькам важна ведаць, што падлеткі няправільна вытлумачваюць эмацыянальны стан іншых людзей. Нават калі ён нейтральны, яны ўсё роўна адчуваюць пагрозу. Таму часта здаецца, што дзеці на роўным месцы заводзяцца. Дарослым важна гэта ўлічваць і быць цярплівымі. Варта стрымліваць негатыўныя эмоцыі, не палохацца і не аддаляцца. У такім узросце вялікі страх быць непрынятым. Таму нягледзячы на тое, што падлетак выглядае монстрам, з якім немагчыма паладзіць, важна, каб бацькі знаходзіліся побач.

***— Але часам здаецца, што падлеткі самі імкнуцца аддаліцца...***

— Бо другая задача ў гэтым узросце — адасобіцца, усвядоміць свае межы. З ёй і звязана тое адчуванне, што падлетак увесь час трымае сябе дзёрзка і робіць нам балюча. Аддаліцца і выйсці ў свет прадугледжвае эвалюцыя. І хоць падлетак адштурхоўвае бацькоў, на самай справе яму патрэбна іх падтрымка. І задача дарослых у гэтым узросце — быць надзейнай гаванню і стартавай пляцоўкай. Каб падлетак ведаў, што прыйдзе дадому і там адпачне. А калі часам здараецца, што дома таксама баявыя дзеянні, дзіця сыходзіць да равеснікаў, у сацсеткі.

Праўда, некаторыя бацькі наладжваюць такія райскія ўмовы, што дзецям нікуды не хочацца выходзіць з дому. Тут «дапамагае» і камп'ютар, які стварае ілюзію жыцця. І падлеткі не спяшаюцца чагосьці дасягаць, не ідуць да равеснікаў. Тут трэба памятаць, што адна з асноўных патрэбнасцяў — выбудоўванне сацыяльных адносін, падлетку важна адчуць сябе ў зграі сярод роўных і быць з аднагодкамі. Бацькоўская любоў — тая няпростая раўнавага, калі мы засцерагаем ад моцных траўмаў, але дазваляем мець вопыт, калі дзіця робіць памылкі, адчувае дыскамфорт і такім чынам вучыцца.

***— Як правільна паводзіць сябе бацькам? Як у такім узросце засцерагчы ад рызыкоўных паводзін?***

— Важна, каб з боку бацькоў падлетак адчуваў паважлівую ўвагу. Часам бацькі чамусьці імкнуцца ўказаць на недахопы, пакрытыкаваць. А дзецям вельмі балюча. Падлетку здаецца, што свет разбурыўся, нават калі на яго паглядзелі неяк не так. Яшчэ адзін важны навык, які патрэбны бацькам, — рабіць паўзы. Хацелася б, каб гэтаму навучыліся і падлеткі. Яны як правіла, імпульсіўныя, у іх не атрымліваецца пачакаць, спрагназаваць. Здавалася б, яны ўсё ведаюць і чулі пра гэта не раз, але ў стрэсе не кантралююць сябе. Да таго ж, як пацвярджаюць даследаванні, у прысутнасці равеснікаў цяга да рызыкі павялічваецца. У адзіночку падлетак ніколі б сябе так не паводзіў, а вось у кампаніі яны спрабуюць вельмі многае і ідуць на рызыку. Падчас эксперымента падлетку казалі, што равеснікі назіраюць за ім з суседняга пакоя — і яго рашэнні тут жа мяняліся. Нешта падобнае праводзілі з пацукамі. Ім прапаноўвалі прымаць алкаголь. Пацук мог спыніцца, калі быў адзін, у адрозненне ад таго, калі ён быў у акружэнні сабе падобных. Нездарма прыводжу такі прыклад — падлеткам так прасцей разумець, што з імі адбываецца. Ім не падабаецца адчуваць сябе прымітыўнымі істотамі, якімі можна маніпуляваць.

У падлеткаў назіраецца дафамінавы дысбаланс. У момант рызыкі яго ўзровень павышаецца, што дае магутныя адчуванні ад жыцця. Калі ўзровень дафаміну зніжаны, падлетак пакутуе ад тугі. Прывяду прыклад яшчэ аднаго эксперымента, падчас якога навукоўцы нават лічылі, што адкрылі цэнтр задавальнення ў мозгу. Пацукі не елі, не пілі, а без канца націскалі на рычажок, які ўзбуджае гэты цэнтр, — аж да смерці. Калі праверылі гэта на людзях, усталяваўшы адпаведныя апараты, высветлілася, што ўдзельнікі даследавання не адчувалі ніякага задавальнення! Было толькі пастаяннае спадзяванне, што яшчэ крыху і яно прыйдзе. Гэта тое ж адчуванне, калі мы, напрыклад, «завісаем» у сацсетках: вось я адкрыю яшчэ адно пісьмо, яшчэ адно відэа і там будзе нарэшце тое, што даставіць мне радасць. Тое ж самае адбываецца падчас ужывання алкаголю. Гэта важна растлумачыць падлетку: калі ён выпіў крыху і яму здаецца, што зараз ён спыніцца, — гэта лжывае адчуванне. Не атрымаецца ў яго спыніцца, бо ён узбудзіў дафамінавую сістэму, і патрабуецца ўсё больш задавальнення.

***— Падлетак у стане гэта пачуць і прыняць да ведама?***

— Канешне! Праўда, не факт, што зможа скарыстацца ў патрэбны момант. З імі неабходна ўсё абмяркоўваць, толькі рабіць гэта варта, калі яны і вы ў спакойным стане. Яны гатовыя размаўляць, асабліва аб сабе. Гэта тэма, якую падтрымае любы падлетак, калі будзе адчуваць, што яго заўважаюць. Але каб нас пачулі, важна быць на адной хвалі. Часта здараецца, дзіця не гатова нас зараз успрымаць, а мы гаворым, гаворым... Спачатку ўсталюйце кантакт. Тут важна не парушаць межы — стукацца ў пакой да падлетка, даваць яму магчымасць пабыць аднаму. Можна сказаць прыкладна так: я разумею, што табе цяжка, але хачу цябе падтрымаць, прыходзь, разам пап'ём гарбаты. Неабходна памятаць, што калі падлетак нешта нам дэманструе сваімі паводзінамі, злуецца, гэта значыць, што яму дрэнна і ён разлічвае, што мы гэта заўважым і дапаможам. А не адмахнёмся: разбірайся сам. Калі дзіця крычыць і крыўдзіцца, гэта лепш, чым калі яно закрыецца і стане сыходзіць.

***— Не сакрэт, што ў камп'ютарах, тэлефонах ды іншых гаджэтах многія падлеткі гатовы праседжваць днямі...***

— Я згадвала пра важнасць кантактавання з равеснікамі, і сёння яно перамясцілася менавіта ў інтэрнэт-прастору. Бацькі часта скардзяцца, што дзеці «там». Але пачынаеш высвятляць, і аказваецца, што калі б была магчымасць дзесьці сабрацца, яны выйшлі б і сустрэліся. Таму няхай кантактуюць хоць бы так, бо без гэтага немагчыма. Так, бывае залежнасць. Ёсць і харчовая залежнасць, але мы ж разумеем, што не можам не карміць дзіця. Важна, чым займаецца падлетак у гаджэтах і якія патрэбы ён задавальняе. Калі ў яго няма сур'ёзных праблем, ён з радасцю адгукнецца на жывое кантактаванне. Часта падлетак і рады б выйсці на вуліцу, але дарослыя самі забараняюць. І тут, дарэчы, дарэмныя спадзяванні бацькоў, што ў выпадку забарон дзіця будзе сядзець і вучыцца.

***— Пераходны ўзрост у дзяўчынак і хлопчыкаў адрозніваецца?***

— Так, ён працякае па-рознаму. У многіх культурах падтрымліваюцца рытуалы сталення, і хлопчыкам варта прайсці нейкія выпрабаванні. Гэта імкненне генетычна закладзена і схільнасць да рызыкі ў хлопчыкаў больш. У дзяўчат іншыя выпрабаванні — спакойна сядзець і вышываць, напрыклад. Але ўсё індывідуальна, у кагосьці гэты крызіс мякі, у некага больш яркі. Сёння шмат кажуць, што ў будучым спатрэбіцца нестандартнасць, крэатыўнасць, і тыя, хто ў падлеткавым узросце актыўна шукае свой шлях, маюць больш шанцаў на паспяховасць. Многія з вялікіх людзей — тыя, хто захаваў падлеткавае мысленне, хто не падпарадкоўваецца стэрэатыпам.

***— Бацькі неяк могуць аблегчыць цячэнне гэтага крызісу?***

— Пра тое, што варта праяўляць паважлівую ўвагу, заўважаць падлетка, мы ўжо казалі. Не дарма бацькоў падколваюць іх дзеці: «Мама, я паеў і ў шапцы». Недастаткова, калі бацькі клапоцяцца толькі пра гэта. Падлеткам трэба, каб дарослыя заўважалі і адлюстроўвалі іх эмацыянальны стан, знешнія змены, жаданні, з якімі яны пакуль не ўмеюць спраўляцца. Нездарма падлеткі імкнуцца да эпатажных змен знешнасці (фарбуюць валасы ў самыя нечаканыя колеры). З аднаго боку, гэта спосаб проста прыцягнуць да сябе ўвагу. З іншага — нярэдка за такім жаданнем стаіць страх быць непрынятым: «Да мяне недружалюбна ставяцца, бо ў мяне такія валасы». Гэта такі спосаб маскіроўкі. Дзецям трэба даваць права выбару ў тым, што бяспечна і магчыма. Інакш сваю патрэбу ўплываць, кантраляваць, зацвярджацца яны будуць кампенсаваць у тым, што нам не спадабаецца.

Часта падлеткі хочуць нейкую рэч, якая для іх статусная. І трэба ім даць магчымасць перажыць адчуванне таго, што яна цяпер у яго ёсць, але нічога пры гэтым не памянялася. Гэта важна адчуць, бо нездарма ж кажуць, што калі ў вас у дзяцінстве не было веласіпеда, а зараз ёсць «Ламбарджыні», то ў дзяцінстве ў вас усё роўна не было веласіпеда. Таму калі гэта сапраўды моцнае жаданне, дайце яму ажыццявіцца. Але тут таксама важная паўза. З падлеткамі праводзілі тэст: давалі 20 долараў і казалі, што праз нейкі час ты атрымаеш 40, калі не патраціш гэтыя 20. Адметна, што з дарослымі падлеткі рэдка трацілі. Калі побач былі равеснікі, то трацілі адразу. Праз 20—30 гадоў высветлілася, што больш паспяховыя тыя, хто ўмеў рабіць паўзу: яны атрымлівалі лепшую адукацыю, былі больш здаровыя. Гэта тлумачыцца тым, што такія людзі ўмеюць стрымліваць свае імпульсы і жаданні. Таму хочаш пафарбаваць валасы — добра, але давай крыху пачакаем, назбірай грошы. І часта падлеткі дзякуюць за гэта, бо жаданне праходзіць. Часам і варта нейкую рэч купіць, дзіця атрымае ўрок: вось я так марыла пра сукенку, а зараз нават не хачу ў ёй нікуды выходзіць. Значыць, наступным разам падлетак падумае, ці сапраўды гэтая рэч патрэбная. Дарэчы, адна з асаблівасцяў цяперашняга пакалення, што падлеткі на траты сям'і ўплываюць як ніколі моцна.

**Хоць падлетак адштурхоўвае бацькоў, на самай справе яму патрэбна іх падтрымка. І задача дарослых у гэтым узросце — быць надзейнай гаванню і стартавай пляцоўкай.**

Для падлеткаў важна справядлівае стаўленне. Гэта не толькі пахвала, але і абмеркаванне няўдач: «Ты малайчына, бо не здаўся, умееш пераадольваць цяжкасці». Не проста казаць: «Ты прыгажуня», а «Ты ўмееш сачыць за сабой, выбраць стыль, падаць сябе». Яшчэ бацькам варта памятаць, што поспех не бывае лінейны. Складана адораным дзецям, якія роўненька падымаліся ўверх і ніколі не падалі. Першае падзенне для іх — катастрофа. Важна заўважаць нават маленькія поспехі, гэта замацуе жаданне рухацца далей.

Але самае галоўнае, што мы павінны даць падлеткам — пачуццё іх каштоўнасці, незалежна ад яго дасягненняў і недахопаў. Важна, каб яны ведалі, што ні на каго іншага мы іх не прамяняем. І прывіць навык наладжваць адносіны — гэта тое, чаму дзіця вучыцца ў сям'і.

Бацькі для падлетка — базавы аэрадром, які забяспечвае бяспеку ў палётах у яшчэ нязведаны, але выдатны свет сталення. Адносіны цеплыні і прыхільнасці — тая страхоўка, якая нават у цяжкай сітуацыі стане падтрымкай і рэсурсам.

**Алена КРАВЕЦ.**

Нататкі шматдзетнага таткі



# ВЕРА ВЯДЗЕ РАССЛЕДАВАННЕ

Сын з'ехаў на некалькі дзён да бабулі. На другі дзень яго адсутнасці пытаюся ў дачок:

— Ну што, сумуеце па браце?

Старэйшая абурана:

— То-бок ён там, у бабулі, атрымлівае асалоду ад жыцця, а мы па ім плакаць павінны?

Вось яна, жаночая логіка: калі мужчына без цябе не пакутуе, то і сумаваць па ім неабавязкова.

☺ ☺ ☺

Сёння раніцай, калі мяне не было дома, Вера падышла да жонкі і ціхім голасам спытала:

— Мама, скажы шчыра: у таты ёсць кнігі, якія ён ад нас хавае?

Жонка сказала, што не, але мяне гэта не надта суцешыла: калі расследаванне вядзе Вера, выратаваць можа толькі чыстасардэчнае прызнанне.

☺ ☺ ☺

Вяду малодшых у школу. Поля:

— Тата, а што ты робіш на рабоце?

— Працую.

— А як?

— Ну як... Сяджу за камп'ютарам, размаўляю па тэлефоне.

— І табе за гэта плацяць грошы?

— Увогуле так.

— Крута! Я таксама хачу працаваць!

P.S. Узрадавала гэта «таксама хачу». Няўжо хтосьці яшчэ хоча працаваць?

☺ ☺ ☺

Тэлефаную дадому, здымае Поля.

— Прывітанне, Поля! Чым займаешся?

— Нічым.

— А Вера?

— Таксама нічым.

Вось яно — шчасце!

Паспрабаваў успомніць, калі апошні раз адказваў гэтак жа. Прыйшоў да высновы, што таксама гадоў у сем. Бо ў восем зразумеў: калі сказаць, што нічым не займаешся, табе вельмі хутка знойдуць работу.

☺ ☺ ☺

Чытаў малодшым на ноч «Нязнайку ў Сонечным горадзе». Па ходзе чытання вырашыў спытаць:

— Як вам здаецца: Нязнайка разумны малы ці не вельмі?

Поля задумалася, а Вера сказала:

— Па-мойму, ён дурань.

Вось і як цяпер далей чытаць?

☺ ☺ ☺

Поля спалохана:

— Тата, ты што, прадаеш нашу машыну?

— З чаго ты ўзяла?

— Мы з Верай бачылі, як нейкі дзядзька паклаў на шкло нашай машыны паперку «куплю вашу машыну».

— А грошы ён з паперкай не паклаў?

— Быццам не.

— Значыць, не прадаю.

P.S. А шкада.

☺ ☺ ☺

У дзяцінстве нам казалі: «Хопіць ужо глядзець тэлевізар, ідзі лепш кніжку пачытай». Цяпер часы змяніліся і даводзіцца ўгаворваць дзяцей паглядзець тэлевізар, толькі б яны не бралі ў рукі чортаў тэлефон (пра кніжку ўжо маўчу). Хоць, зыходзячы з асабістых назіранняў, прагляд тэлевізара аднача-совай перапісцы ва «УКантакце» не перашкаджае.

Хто б мог падумаць у былыя часы, што ў тэлефонах тоіцца такая небяспека. З выгляду тэлефоны заўсёды былі найбольш бяскрыўднымі апаратамі ў доме, калі параўноўваць з тымі ж тэлевізарамі ці прасамі. А яно вунь як выйшла...

Думаю, у будучым варта больш пільна прыглядзецца да прасаў. У іх, на мой погляд, схаваны вельмі сур'ёзны патэнцыял.

**Павел ХОЛАД.**

# КАЛЯНДАРЫК ВАМ У ДАПАМОГУ,

## або Пра што раскажа жаночы арганізм

**Як выбраць найлепшы час для зачацця альбо папярэдзіць цяжарнасць без выкарыстання кантрацэптываў? У наш час, калі чалавецтва зноў загаварыла пра моду на ўсё натуральнае і бяспечнае, «экалагічнае сужэнства» (падчас якога пары выкарыстоўваюць сімптома-тэрмальны метад распазнавання пладнасці) набывае ўсё больш прыхільнікаў.**

Метады распазнавання пладнасці (здольнасці да зачацця) не выклікаюць ні часовага, ні пастаяннага бясплоддзя. Яны абапіраюцца на веды пра фізіялагічныя асаблівасці жаночага і мужчынскага арганізмаў. І сёння мільёны пар ва ўсім свеце з'яўляюцца прыхільнікамі «экалагічнага сужэнства». Даследаванні паказваюць, што ў такіх сем'ях бывае менш разводаў, а падобныя веды бацькі пачалі перадаваць сваім дзецям.

Самая галоўная перавага згаданага метаду планавання — паміж мужчынам і жанчынай не стаяць штучныя сродкі кантрацэпцыі (прэзерватывы, спіралі, гарманальныя прэпараты), і гэта дае магчымасць захаваць жаночае здароўе. Падобны спосаб планавання вядомы са старажытнасці, але навуковыя даследаванні, якія пацвярджаюць яго эфектыўнасць, былі праведзены толькі ў мінулым стагоддзі. Апошнім часам і беларускія даследчыкі ўдзялілі яму ўвагу — на базе Гомельскага медуніверсітэта праведзена даследаванне, прысвечанае сімптома-тэрмальнаму метаду распазнавання пладнасці. Справа ў тым, што апошнім часам усё больш сужэнцаў сутыкаюцца з немагчымасцю зачаць дзіця. Часцей гэта звязана не з бясплоддзем мужчыны ці жанчыны, а з так званай паніжанай пладавітасцю, і будучым мамам важна навучыцца назіраць за арганізмам, каб вызначыць найбольш спрыяльныя для зачацця дні.



«Сёння я магу парэкамендаваць пацыентцы ў пэўных сітуацыях адкласці зачацце альбо дапамагчы пры паніжанай пладнасці, — заўважае **акушэр-гінеколаг, выкладчык Барысаўскага дзяржаўнага медыцынскага каледжа Святлана МАЗГУНОВА.** — Асноўныя паказчыкі пры такім метадзе — цэрвікальны сакрэт, паказанне тэмпературы цела і стан шыйкі маткі. Яны наносяцца на спецыяльную карту, якая лёгка чытаецца.

**«У жанчыны, якая захоўвае цнатлівасць да шлюбу, верагоднасць захавання сям'і — 80 працэнтаў. З кожным новым партнёрам яна страчвае гэтую здольнасць».**

Жанчына, якая назірае за сваім арганізмам, ведае дні, у якія яна не павінна зацяжарыць. Практыкуючы экалагічнае сужэнства, можна папярэджваць цяжарнасць без выкарыстання кантрацэптываў. Эфектыўнасць метаду — каля 98 працэнтаў. І сёння яму можна навучыцца ў тым ліку анлайн. Жанчыны могуць абзавесціся ўласным «каляндарыкам», дзякуючы якому навучацца «чытаць» свой арганізм.

Па рэкамендацыі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў многіх краінах свету створаны асацыяцыі настаўнікаў Метаду распазнавання пладнасці. Новыя веды сталі выкладаць дзецям і моладзі. Падчас круглага стала, які праводзіўся нядаўна ў Мінску ў межах форуму «Святасць мацярынства», урач-гінеколаг, выкладчык Варшаўскага медыцынскага ўніверсітэта Ева Слізень-Кучапска паведаміла, што сёння ў Польшчы ўдзяляецца вялікая ўвага прафілактыцы праблем дзетароднага здароўя, а ў школах уведзены абавязковы прадмет «Выхаванне для жыцця ў сям'і» — акцэнт робіцца на выхаванне моладзі ў цнатлівасці, падрыхтоўку да будучага бацькоўства.

У нашай краіне, на жаль, пакуль не хапае пэўнага інстытута, які абмяркоўваў бы з падрастаючым пакаленнем далікатныя тэмы. Не толькі школа, але і бацькі не гавораць з падлеткамі «пра гэта». І добра, што з'явіліся грамадскія ініцыятывы, якія хочуць дапамагчы маладым.

— Часта да нас на занятки прыходзяць падлеткі, моладзь і кажуць: «Вы першыя дарослыя, якія пагаварылі з намі пра цнатлівасць». Мы не можам пакідаць нашых дзяцей у інфармацыйным вакууме. Ёсць даследаванні, якія паказваюць, што ў жанчыны, якая захоўвае цнатлівасць да шлюбу, верагоднасць захавання сям'і — 80 працэнтаў. З кожным новым партнёрам яна страчвае гэтую здольнасць. Нават, калі ў яе быў адзін дашлюбны мужчына, лічба зніжаецца ўжо да 54 працэнтаў. Пра гэта трэба гаварыць дзецям, — упэўнена **Вераніка СЯРДЗЮК, старшыня дабрачыннага аб'яднання «Цэнтр падтрымкі сям'і і мацярынства «Матуля».** — Сёння падлеткаў толькі палохаюць. Цяжарнасць падаецца ў адной звязцы з інфармацыяй пра захворванні, якія перадаюцца палавым шляхам. Гэта вельмі небяспечна. Так мы даём няправільныя ўстаноўкі пра мацярынства.

Арганізацыя запусціла адукацыйны праект для падлеткаў «Еве 13», мэта якога — фарміраванне ў дзяўчат адказнага стаўлення да свайго рэпрадуктыўнага здароўя, выхаванне цнатлівасці. У той жа час на такіх занятках не гавораць нічога лішняга. «Мы спрабуем супрацьстаяць ранняй сексуалізацыі дзяцей. Хочам расказваць толькі тое, што пазітыўна ўплывае на мацярынства, сямейнае шчасце і на самапавагу», — заўважае Вераніка Сярдзюк.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# ЯК ПЯКЛІ МЫ АБРОЎСКІ КАРАВАЙ...



**Знаёмства з каравайніцай, вядомай на ўсю вёску Аброва і Івацэвіцкі раён, Нінай Васілеўнай ВАРАНКОВІЧ — гэта як подых дзяцінства. Яе пяшчотны і ласкавы голас гаіў душу, і хата ў духмяным паху каравая была дужа роднай і шчымліва ўтульнай. Здавалася, гэта самае надзейнае месца на свеце для спакою, шчырасці і ціхай радасці. Менавіта — для размеранага жыцця, якім жылі нашы продкі. У гэтым асяродку пад ласкавую гаману бабулі Ніны востра адчувалася тое, што цанілі і берaглі нашы дзяды і прадзеды. І спёка летняга дня была не спёкай, а цеплынёй, якой так многа было ў душы гэтай жанчыны.**







Ніна Васілеўна — карэнная абраўчанка ці, як па-мясцоваму тут кажуць, абрэўка. Аграгарадок Аброва — вялікі, жыхароў пад тысячу. Гэта адзіны вясковы населены пункт у раёне, дзе ёсць бульвар. Тут захаваўся «Намскі Вялікдзень», абрад, занесены ў спіс нематэрыяльных каштоўнасцяў Беларусі, а людзі вызначаюцца праматой у поглядах і прагнасцю да працы і да зямлі.

***— А хто навучыў хлеб пячы? — цікаўлюся, калі Ніна Васілеўна прыгатавалася паліць у печы.***

— Першая навука — ад маці. Як мама пякла тады? Увечары рашчыніць, а зранку замесіць. Печ запаліць, а як выгарыць усё, тады пасаджае, ды і ўсё. Хлеб быў тады жытні, не пшанічны. І, памятаю, у дзяцінстве хлеб пяклі пшанічны (пшаніцу ж сеялі) — на Вялікдзень, на Каляды, на Вадзяную Каляду перад Вадохрышчам... І пірагі, і бондачку малую. Бондачка — гэта малая булачка. Мама заўсёды пякла свой хлеб.



***— Дзе вы з мужам пазнаёміліся?***

— Будучы муж, Бярнард Іванавіч, прыехаў працаваць настаўнікам у вёску Аброва ў 1957 годзе. Родам ён з Нясвіжскага раёна, з каталіцкай сям'і. Іх у сям'і было чацвёра. Старэйшы сын працаваў матэматыкам у Віцебскай вобласці, а малодшы — кандыдат навук — у Мінску жыў. Бярнард Іванавіч працаваў завучам у Аброве, вёў рускую і беларускую мовы, літаратуру, іншы раз і нямецкую. Ён кватараваў у маёй хроснай разам з ветурачом. Хросная — адзінокая жанчына і, убачыўшы, што я прыехала на пабыўку дадому, кажа мне: «Ніна, прыйдзі падлогу памыць у хаце, ды заадно хлопцам сарочкі памый». Я, колькі дома была, прыходзіла кожную суботу да іх прыбіраць. А ў 1963 годзе паехала ў Саратаўскую вобласць у заробкі. Вярнулася ў 1964 годзе, зноў стала хадзіць прыбіраць у хлопцаў. Неяк кажу Бярнарду Іванавічу, што збіраюся ехаць зноў у заробкі. А ён адказвае: «Нікуды ты не паедзеш». Я ўзнімаю вочы і здзіўлена пытаю: «Чаму?» — «Ты выйдзеш за мяне замуж?» Я ад нечаканасці анямела і маўчу. А ён пытае: «Чаго маўчыш?» — «А ты што, праўда жэнішся?» — «Заўтра ідзём распісвацца».

Вось так мы і распісаліся. І пражылі разам 41 год у міры і згодзе, дзякаваць Богу, усім жадаю такога жыцця. Бярнард Іванавіч працаваў завучам да пенсіі і яшчэ на пенсіі два гады, а я ў бухгалтэрыі. Выгадавалі чацвёра дзяцей, але адзін сын загінуў у аварыі. Затое ёсць дзевяць унукаў і шэсць праўнукаў.

...Апоўдні Ніна Васілеўна запальвае ў печы. І паднімае край чыстага ручніка, якім накрыта міска з цестам. Яно падышло да краёў.

***— Чарговы каравай будзе для каго?***

— Для Уладыкі Стэфана, архіепіскапа Пінскага і Лунінецкага. Я неяк ужо сустракала яго караваем, спечаным сваімі рукамі, дык ён сказаў потым, што нідзе яго не сустракалі такім караваем, як у Аброве. А матушка з Лунінца не верыла, казала: «Ну што там ужо за каравай такі?» Калі сын яе жаніўся, то я і яму спякла на вяселле. Тады матушка згадзілася, што смачны. Пякла я прасфоры для царквы болей за дзесяць гадоў — пасля мяне ўжо трэці чалавек пячэ. Калі б здароўе не падводзіла, то бацюшка мяне не адпусціў бы.

***— У чым жа сакрэт вашага каравая?***

— Скажу, што вельмі шмат залежыць ад мукі. Купіла я вось «Полацкую класічную». Харошы хлеб атрымліваецца, але на два дні. А потым усярэдзіне робіцца клейкі, ужо есці такі не будзеш, дык курам аддаю.

Яшчэ муку брала «Прыбужскую», таксама добрая, але тое ж — на два-тры дні. Цеста на хлеб простае: мука, соль, вада... А для каравая здоба трэба: малако ці сыроватка.

Закваску Ніна Васілеўна выліла ў вялікую міску яшчэ ўранку і замясіла цеста: пяць яек, два кілаграмы мукі, 230 грамаў маргарыну, 500 грамаў цукру і адзін літр малака.

— Цеста, бачыце, слабое. Таму мясіць яго трэба доўга, пакуль не стане рука чыстая, — тлумачыць Ніна Васілеўна. — На гэта трэба гадзіна, а то і паўтары. Пакуль пасадзіш каравай у печ, трэба абмяць цеста два-тры разы. Вось праз некалькі гадзін у печы выпаліцца, тады яго пасаджу на чарэнь. А пакуль час ад часу за цестам паглядаю, каб не ўцякло, абмінаю. І кветачкі падрыхтую, як пасаджу каравай у печ.

Ніна Варанковіч кажа, што раней на вяселлі караваі толькі ў яе заказвалі. Бывала, што за дзень яна пякла па пяць-шэсць караваяў. А цяпер толькі калі ў клубе на свята якое папросяць ці сваякам на вяселле...

Тым часам цеста падышло, і Ніна Васілеўна садзіць каравай у печ. І бондачку таксама. А ў гэты час з астаткаў цеста выразаюцца кветачкі, вяровачкі, крыжык. Падпечаны каравай змазваецца яйкам, і на яго выкладваюцца ўпрыгожанні. Спачатку крыжык, вяровачка па краі, а потым кветачкі і лісточкі. Ніна Васілеўна робіць усё з такой пяшчотай — нібы каля дзіцяці завіхаецца, раз-пораз гладзіць каравай.

І зноў — у печ. Момант, калі каравай можна дастаць для ўпрыгожання, трэба адчуваць — каб цеста не апала, і каб кветачкі не падгарэлі, а атрымаліся жоўценькія.

Тым часам Ніна Васілеўна дастае з шафы дарагія ўзнагароды — сярод іх дзве граматы аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Івацэвіцкага райвыканкама за 2016 і 2017 гады — за развіццё традыцыйных промыслаў і рамёстваў, актыўны ўдзел у выставачнай дзейнасці вёскі і раёна і ў святкаванні 500-годдзя Аброва.

***— Вышыўкі ў хаце зроблены вашымі рукамі? — звяртаю ўвагу на прыгажосць.***

— Усё сама. Вышывала, вязала, шыла, а цяпер на адно вока аслепла. Люблю песні слухаць — народныя, не такія, як сёння грукацяць. Раней жыць было весела. Сонца на зямлю, а ўжо музыка па вёсцы грае. Памыешся, ногі апаласнеш і туды. Бывала, я замужам ужо была, а музыку пачую і так хачу на танцы. Ён мяне і адпусціць. Я каласок закручу, апрануся і куляй туды. Патанцую, душу адвяду і дадому. А сёння адзін камп'ютар у дзяцей у галаве, сядзяць у ім дзень і ноч, здароўе губляюць, сонца не бачаць.

...Хата напоўнілася водарам каравая. Час даставаць яго з печы. З міскі ён выскачыў лёгка, бы мячык. Пачаліся прыгатаванні для фотаздымка, і Ніна Васілеўна пайшла апранацца... Яна стаяла ў залацістых туфлях, у вышытым адзенні і была такая прыгожая! Каравай урачыста, беражліва паклала на ручнік і стала з ім побач у сонечным пакоі. І так светла стала на душы!

**Валянціна БОБРЫК.**
**Фота Елізаветы БОБРЫК і Ірыны АМЕЛЬЧАНКІ.**

Валанцёры 50+

# ЖЫЦЬ НЕ ТОЛЬКІ ДЛЯ СЯБЕ



— Сёння серада. Ужо 11 гадзін. Дзе ж мой «спонсар»? — пытаецца бабуля Марыя. «Спонсарамі» яна часам называе валанцёраў. А спадарыня Зоя Пастухова — яе «асабісты» валанцёр. Бабуля так вырашыла і з нецярпеннем чакае яе.

Зоя Міхайлаўна ўжо другі год наведвае пацыентаў аддзялення сястрынскага догляду Мінскага хоспіса для дарослых. Яна вывозіць іх на вуліцу ў інвалідных калясках, размаўляе з імі, кантактуе са сваякамі.

Мінулым летам у бальніцы ляжаў пацыент — прыгожы, разумны, адукаваны, інтэлігентны мужчына за 50. І цалкам нерухомы. Зоя Міхайлаўна наведвала яго, падоўгу размаўляла, бо Леанід (так звалі пацыента) цікавіўся ўсім на свеце, а спадарыня Зоя, якая калісьці займала кіруючую пасаду і аб'ездзіла амаль увесь свет, з задавальненнем адказвала на яго пытанні. Падтрымліваць размову з Леанідам было зусім не лёгка, бо гаварыў ён вельмі ціха — гучней не мог з-за цяжкай хваробы, і, каб зразумець яго, трэба было схіляцца над самым яго тварам, нізка-нізка. Зоя Міхайлаўна пазнаёмілася і з жонкай Леаніда. Яны абмяняліся нумарамі тэлефонаў, а калі Леанід выпісаўся з бальніцы, спадарыня Зоя тэлефанавала жанчыне, а тая перадавала словы падтрымкі мужу.

Спадарыня Зоя натхніла на валанцёрства і сваю 80-гадовую сяброўку — спадарыню Веру Паўлічкову, якая таксама наведвае бальніцу раз на тыдзень, выводзіць на вуліцу хадзячых пацыентаў, размаўляе з імі, частуе піражкамі ўласнай выпечкі. Бабуля Вера заходзіць у бальніцу, абапіраючыся на кіёчак. Потым пакідае яго ў ардынатарскай разам з торбачкай і ідзе да сваіх падапечных. А калі надыходзіць час вяртацца дамоў, яна забірае торбачку, а пра кіёчак звычайна забываецца. Тады мы з калегай-псіхолагам даганяем яе, уручаем кіёчак і даводзім бабулі, што яна можа цудоўна абыходзіцца і без яго. Яна пагаджаецца, але наступны раз усё адно прыходзіць з ім. Спадарыня Вера мае вышэйшую адукацыю. Да пенсіі яна працавала інжынерам. Бабуля цікавіцца сучаснай камп'ютарнай тэхнікай і кажа, што ў наш час кожны чалавек павінен мець планшэт, бо ў інтэрнэце можна знайсці шмат цікавай і карыснай інфармацыі на розныя тэмы.

Неяк спадарыня Зоя спытала, ці ёсць яшчэ, акрамя іх з бабуляй Верай, валанцёры сталага веку, якія наведваюць пацыентаў хоспіса. І мне адразу ж успомнілася бабуля Жэня, якая прыходзіла да пацыентаў паліятыўнага аддзялення, калі я там працавала. Бабулі Жэні было за 70. Яна наведвала пацыентаў з апошняй стадыяй анкалогіі. Заходзіла ў палату, камусьці з пацыентаў дарыла шакаладку, камусьці — мандарынку, камусьці — усмешку і добрыя словы. Памятаю, як яна расчэсвала валасы адной самотнай жанчыне і рабіла ёй прыгожыя прычоскі. Бабуля Жэня сама перанесла складаную аперацыю і ведала, якую вялікую патрэбу ў спагадзе, падтрымцы, увазе і дабрыні маюць цяжкахворыя людзі.

**Спадарыня Вера Паўлічкова таксама наведвае бальніцу раз на тыдзень, выводзіць на вуліцу хадзячых пацыентаў, размаўляе з імі, частуе піражкамі ўласнай выпечкі. Бабуля Вера заходзіць у бальніцу, абапіраючыся на кіёчак. Потым пакідае яго ў ардынатарскай разам з торбачкай і ідзе да сваіх падапечных. А калі надыходзіць час вяртацца дамоў, яна забірае торбачку, а пра кіёчак звычайна забываецца.**

У аддзяленне сястрынскага догляду на працягу некалькіх месяцаў прыходзіла сямейная пара пад 60, таксама валанцёры. Спачатку прыйшла жонка. Яна размаўляла з пацыентамі, дапамагала карміць зусім нямоглых, прыносіла самотным старым розныя пачастункі. Неўзабаве да яе далучыўся і муж. Ён выконваў «фізічную» працу — вывозіў на вуліцу пацыентаў у інвалідных калясках.

Прыходзіць у хоспіс і шмат маладых валанцёраў, але гэта ўжо асобная тэма. А летам разам з жанчынай-валанцёрам прыходзіў у аддзяленне сястрынскага догляду і... валанцёр-сабака — Сільвер. Сільвер кантактаваў з пацыентамі ў бальнічным двары, калі было добрае, цёплае надвор'е. Ён быў вельмі добразычлівы і спакойны. Сільвер цудоўна ведаў, як можна хутка падняць настрой цяжкахворым людзям — ён з задавальненнем дазваляў сябе пагладзіць. А калі Мікалай, пацыент з выдатным голасам, вельмі прыгожа праспяваў песню (а ўсе іншыя прысутныя падпявалі яму), Сільвер падышоў да яго і па-свойму, па-сабачы, падзякаваў за цудоўнае выкананне...

А яшчэ мне ўспомніўся гродзенскі валанцёрскі рух з прыгожай назвай «Цэнтр дапамогі жыццю», удзельнікі якога падтрымліваюць пацыентаў хоспісаў у Гродне, Мінску і іншых гарадах Беларусі. Валанцёрская дапамога зусім не «аднабаковая», як часам камусьці здаецца. Валанцёры не толькі аддаюць, але і атрымліваюць, бо чалавек, які жыве не толькі для сябе, не будзе баяцца адысці ў іншы свет.

**Марына БАБРОЎСКАЯ.**


**Извещение о проведении 27 декабря 2018 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 7»**

| **Предмет торгов** |
|---|
| Здание административно-хозяйственное (бытовые помещения с котельной с инвентарным номером 420/С-35887) общей площадью 70,6 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, Лидский район, Дубровенский с/с, 14 в районе дер. Обманичи; здание административно-хозяйственное (здание бытового корпуса со складскими помещениями с инвентарным номером 420/С-36635) общей площадью 252,4 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, Лидский район, Дубровенский с/с, 12 в районе дер. Обманичи; сооружение неустановленного назначения (сооружение благоустройства с инвентарным номером 420/С-47349) общей площадью 6456,88 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, Лидский район, Дубровенский с/с, в районе дер. Обманичи, сооружение благоустройства объекта АБЗ ст. Гутно, участок № 3; сооружение неустановленного назначения (сооружение благоустройства с инвентарным номером 420/С-47350) общей площадью 2781,0 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, Лидский район, Дубровенский с/с, в районе дер. Обманичи, сооружение благоустройства объекта АБЗ ст. Гутно, участок № 4; агрегат минерального порошка ДС-185 (инв. № 042674); агрегат целлюлозной добавки (инв. № 042690); асфальтобетоносмеситель ДС-158 (инв. № 042652); бункер-накопитель /металлоконструкция/ (инв. № 042695); грохот СМД-107 (инв. № 042372); конвейер ленточный КЛ-РОЛ-5 (инв. № 041663); конвейер ленточный ТК-172 (инв. № 041655); три конвейера ТК-18 (инв. №№ 041532, 041533 и 041534); подогреватель жидкого теплоносителя (инв. № 042658); четыре цистерны 20 куб. м (инв. №№ 020100, 020101, 020102 и 020103); комплектная трансформаторная подстанция КТП-250 (инв. № 040086); два резервуара стальных 60 и 50 куб. м соответственно (инв. №№ 20097 и 593,3) |
| **Начальная цена:** 66 800,17 бел. руб. с учетом НДС |
| **Сумма задатка:** 6 600,00 бел. руб. |
| **Обременение:** аренда |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 7», 223021, Минская обл., Минский р-н, 500 м восточнее д. Богатырево, АБК, тел. (017) 507-61-83.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск, тел. (017) 327-05-62.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 7», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 27 декабря 2018 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 13.12.2018 по 26.12.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 507-61-83 (ОАО «ДСТ №7»)

**Объявление о торгах**

| | |
|---|---|
| Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества | Лот № 1. Автомобиль КРАЙСЛЕР 300М гос. № 6541 ВЕ-2, 1999 года выпуска. Первоначальная стоимость – 1 780, 80 руб. |
| Собственник (владелец) имущества | Пульянов Сергей Олегович |
| Местонахождение (адрес) имущества | г. Витебск, ул. 3-я Чепинская, 41 |
| Информация об обременениях | Без обременений |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | г. Орша, ул. Островского, 36, каб. 10, **4 января 2019 года в 11.00** |
| Справочная информация | Отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши, 211391, г. Орша, ул. Островского, 36. Судебный исполнитель – Федоненкова Наталья Сергеевна, тел. 80216543208, 8(033) 3998311 |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши BY22AKBB36429030007942200000, УНП 300002505, ОАО «Беларусбанк», БИК AKBBBY21215, не позднее 12.00 3 января 2019 года. Минимальная величина первого шага – 5 % стоимости каждого лота. В соответствии со ст. 97 Закона «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги |

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

**Организатор торгов:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-14.

**Продавец:** ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей», 210002, г. Витебск, ул. Максима Горького, 62, тел.: (029) 892-40-22, (029) 891-42-66

| Наименование объекта, начальная цена, задаток |
|---|
| Лоты №№ 1–33. Станки ткацкие СТБ-2-180, инв №№ 142611, 142613, 142614, 142615, 143683, 143690, 143704, 143705, 143717, 143719, 143720, 143721, 143729, 143815, 143849, 143863, 143865, 143873, 143874, 143892, 143895, 143898, 143900, 143923, 144800, 144801, 142622, 144848, 144849, 144850, 144851, 144852, 144853. Нач. цена за 1 лот: 665,00 бел. руб. без НДС. Задаток на 1 лот: 66,50 бел. руб. |
| Лоты №№ 34–36. Воздухосборники (емкости б/у) объем 10 куб. м, 3 шт. Нач. цена за 1 лот: 540,00 бел. руб. без НДС. Задаток за 1 лот: 54,00 бел. руб |
| Лоты №№ 37–40. Воздухосборники (емкости б/у) объем 6 куб. м, 4 шт. Нач. цена за 1 лот: 405,00 бел. руб. без НДС. Задаток за 1 лот: 40,50 бел. руб. |
| Лот № 41. Резервуар стальной б/у 2,5 куб. м, инв. № 18570. Нач. цена: 135,00 00 бел. руб. без НДС. Задаток: 13,50 бел. руб. |
| Лоты №№ 42–43. Емкости стальные б/у 2,5 куб. м, инв. №№ 181344, 181343. Нач. цена за 1 лот: 135,00 бел. руб. без НДС. Задаток: 13,50 бел. руб. |
| **Повторные торги** состоятся 28.12.2018 в 12.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и подачи заявлений на участие в торгах: с 13.12.2018 с 8.30 по 27.12.2018 до 17.30. Шаг аукциона устанавливается в сумме 5 % от начальной цены лота. **Условия:** оплата НДС сверх цены продажи имущества |

Задаток перечисляется: р/с № BY70BLBB30120300082525001001 (бел. руб.); BY43BLBB30120300082525001002 (USD); BY16BLBB30120300082525001003 (EUR); BY86BLBB30120300082525001004 (RUB) в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Витебской обл., BIC BLBBBY2X, УНН 300082525. Получатель платежа: ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей». Задаток за участие в аукционе резидентами Республики Беларусь осуществляется в белорусских рублях, нерезидентами – в иностранной валюте с применением официального курса Национального банка Республики Беларусь на день платежа. В случае перечисления денежных средств в иностранной валюте, комиссия по конвертации и переводу валюты осуществляется за счет покупателя. Заявления на участие в торгах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Торги проводятся в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 5 дней со дня проведения торгов: возместить затраты на организацию и проведение торгов, затраты по оценке имущества, изготовлению документации, необходимой для проведения торгов; в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов подписать договор купли-продажи; оплатить предмет торгов и НДС в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи. Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее чем за 5 дней до даты их проведения. Ознакомление с имуществом осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00. Объекты находятся по адресу: г. Витебск, ул. Максима Горького, 62. Имущество, выставляемое на торги, бывшее в употреблении. Конт. тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.

**Антикризисный управляющий частное предприятие «Антикризистим» объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества частного инвестиционного унитарного предприятия «ФОНДО» (дата торгов: 28.12.2018 в 10.00)**

Место проведения торгов: г. Минск, ул. Б. Берута, 3Б, оф. 517, тел. 8 029 3360872.

Подробная информация о дате, времени и порядке проведения торгов, предлагаемых к продаже лотах, начальной цене и размере задатков, продавце и организаторе, иная информация требуемая в соответствии с законодательством размещены в Едином государственном реестре сведений о банкротстве: http://bankrot.gov.by. УНП 193010846

Пункт погляду

# ЧАС, АДУКАЦЫЯ І ЗАРОБАК —

## ТРЫ ПРАБЛЕМЫ ШМАТДЗЕТНЫХ МАЦІ

**Сёння існуе каласальная дзяржаўная падтрымка сем'яў з дзецьмі, якая забяспечыла паніжэнне рызыкі іх беднасці і аказала станоўчы ўплыў на нараджальнасць. Вялікі ўнёсак быў зроблены ў 2012—2013 гадах, калі павялічыліся выплаты, а дапамогу на дзяцей «прывязалі» да сярэдняга заробку ў Беларусі. Памеры дзіцячых выплат бываюць нават большыя за заробак, на які могуць разлічваць жанчыны. Але дзеці растуць, і, рана ці позна шматдзетныя мамы, якія займаліся выхаваннем сваёй малечы некалькі дэкрэтных запар, вымушаны выйсці на работу ці шукаць новую. З якімі праблемамі яны сутыкаюцца і як іх пераадольваюць?**

### ПАМІЖ РАБОТАЙ І СЯМ'ЁЙ

— Апошні мой дэкрэтны водпуск доўжыўся пяць гадоў, — расказвае **Юлія КАРАЛЬ** з Мінска. — На самай справе, шукаць работу мне не прыйшлося, бо вярнулася туды, адкуль сыходзіла ў дэкрэт. Даволі хутка адаптавалася на рабоце, але ў мяне раз-пораз узнікаюць непрыемнасці... Нядаўна дачка захварэла на гаймарыт — даволі сур'ёзная праблема. А ўсё чаму? Бо да гэтага я старалася не браць бальнічныя лісты. Маё дзіця часта хварэла на ВРЗ, але здавалася, што прастуда — дробязь у параўнанні з добрымі адносінамі з работадаўцам, які быў вельмі незадаволены маімі паходамі на бальнічны. Асабліва цяжка, калі дзеці, а іх у мяне трое, пачыналі хварэць адно за адным. Таму і старалася не браць бальнічныя... Вынік — гаймарыт. У дэкрэтным было лягчэй. Даход хоць і напалову меншы, але нам нават удавалася адкладваць грошы. Зараз — не. Не заўсёды хапае часу нагатаваць карыснай ежы, і прыходзіцца набываць паўфабрыкаты. Вельмі шмат грошай выдаткоўваем на дзіцячую адукацыю. Толькі адна развіццёвая школа на дваіх малодшых з'ядае 90 рублёў заробку. А гэта не адзіная патрэба маіх дзяцей. Канешне, можна і дома з імі пазаймацца. А калі? З раніцы на работу. Прыходжу ўвечары, праверыла ўрокі, паелі, прыбраліся і ўсе — час спаць. А на выхадных трэба пачысціць, памыць, папрасаваць, нагатаваць... Пакінуць работу немагчыма, бо трэба, самі разумеце, зарабляць на пенсію.

Самая вялікая праблема жанчын пасля выхаду на работу — гэта час. Яго не хапае, каб пазаймацца, пагаварыць з кожным малым... Дзеці могуць наведваць розныя школы, садкі, гурткі, якія не заўсёды знаходзяцца побач з домам, і да таго каштуюць грошай. Жанчынам, якія свядома нараджалі дзетак, даводзіцца проста разрывацца паміж работай і сям'ёй.

### ДАЙСЦІ ДА ЦЭНТРА ЗАНЯТАСЦІ

Адукацыя, дарэчы, з'яўляецца другой праблемай. Часам жанчыны сыходзяць у дэкрэт увогуле амаль што адразу пасля заканчэння школы. У выніку пасля працяглага дэкрэтнага на рынку працы такая прэтэндэнтка проста прайграе бяздзетным равесніцам.

— Да першага дэкрэтнага я не працавала, — расказала **Ілона СТРЭЖ з Бабруйска.**— Адразу амаль са школьнай лаўкі — у дэкрэтны. І хоць паступіла ў каледж на юрыста, але тады яшчэ не скончыла... Вырашыла звярнуцца ў Цэнтр занятасці насельніцтва і там атрымала адукацыю прадаўца. На той час мне вельмі дапамагалі цётка і сястра, якія папросту даглядалі маіх дзетак, пакуль мяне не было дома. Калі б ніхто не дапамагаў, наўрад ці атрымала б адукацыю. Пасля курсаў адразу пайшла працаваць прадаўцом. Было цяжка, але мне вельмі пашанцавала з кіраўніком — ён заўсёды ішоў мне насустрач, нават калі дзеці хварэлі. Да таго ж у мяне і з напарніцай былі добрыя адносіны. Калі мне патрэбна было сыходзіць на сесію (вучылася завочна), яна мяне падмяняла, а потым я адпрацоўвала за яе. Графік быў зручны: два дні праз два. Адукацыя сёння мае вялікую ролю. Работадаўца з большым задавальненнем возьме спецыяліста, чым кагосьці з сярэдняй адукацыяй.

У Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны расказалі, што дапамагаюць з адукацыяй усім беспрацоўным і з працаўладкаваннем — усім, хто да іх звяртаецца.

— Для людзей, якія доўга не працавалі ці проста не могуць знайсці работу па той спецыяльнасці, якая ў іх ёсць, арганізаваны спецыяльныя курсы па павышэнні кваліфікацыі і курсы па атрыманні новай прафесіі,— расказвае **начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі Алег ТОКУН.** — Курсы арганізаваны зыходзячы з патрэбаў пэўнага рэгіёна і запрасаў работадаўцаў. Акрамя курсаў, распрацаваны некалькі дзяржаўных праграм па сацыяльнай абароне і садзейнічанні занятасці насельніцтва.

Напрыклад, праграма перасялення. Сутнасць яе ў тым, што чалавек, які не можа знайсці работу ў сваім рэгіёне, пераязджае туды, дзе патрабуюцца спецыялісты яго кваліфікацыі. На новым месцы даюць жыллё. Гэта могуць быць дом, кватэра ці інтэрнат — у залежнасці ад наймальніка. Акрамя таго, выплачваюцца пад'ёмныя ў памеры сямі бюджэтаў пражытковага мінімуму, а калі чалавек пераязджае ў сельскую мясцовасць, то 9 такіх бюджэтаў. Таксама кампенсуюцца ўсе расходы па перавозцы маёмасці.



— Ёсць праграмы, праз якія мы дапамагаем чалавеку распачаць свой бізнес, — дадае спецыяліст. — Па-першае, мы можам спачатку навучыць такіх людзей асновам прадпрымальніцкай дзейнасці: як рэгістравацца, якія падаткі плаціць і г. д. Людзі падчас гэтых курсаў атрымліваюць першапачатковыя веды па праве і эканоміцы. Калі ж чалавек рашаецца адкрыць сваю справу, то потым мы можам дапамагчы і фінансава. У рамках праграмы выдзяляецца субсідыя на арганізацыю прадпрымальніцкай дзейнасці. Але яе абавязкова трэба выкарыстаць па мэтавым прызначэнні. Чалавек сам вызначае, куды пойдуць грошы, у сваім бізнес-плане. Памеры субсідый адрозніваюцца, але ў цэлым яна складае каля 11 бюджэтаў пражытковага мінімуму. А калі чалавек арганізуе справу ў сельскай мясцовасці, то гэта 15 бюджэтаў. Ва ўсіх абласцях зацверджаны прыярытэтныя віды прадпрымальніцкай дзейнасці, важныя для развіцця рэгіёнаў. І калі чалавек будзе арганізоўваць менавіта такую справу, то хутчэй за ўсе, ён гэтую субсідыю атрымае.

У выпадку з адукацыяй і пошукам работы для жанчыны — трэба дабрацца да мясцовага цэнтра занятасці, папрасіць дапамогі і... знайсці людзей, якія будуць даглядаць малых, пакуль яна атрымлівае адукацыю.

### НЯГЛЕДЗЯЧЫ НА ЎСЕ ЦЯЖКАСЦІ

Калі чалавек хоча працаваць, то, канешне, работу знойдзе. Пытанне застаецца з заробкам, бо са з'яўленнем кожнага новага члена сям'і прапарцыянальна павялічваюцца і яе патрэбы. Дзе шукаюць выйсце маці, якія могуць напрацаваць на сярэдні заробак, але яго папросту не хапае на ўсіх?

— У мяне дзевяць дзяцей, — расказвае **Ала СКАРАБАГАТАЯ з Мінска.** — Усіх сама пад сэрцам вынасіла. Старэйшаму ўжо трыццаць гадоў, а малодшаму — шэсць. У 23 гады ў мяне нарадзілася першае дзіця. Я не адчувала сябе стомленай, напэўна таму, што сама па характары вельмі актыўная. Такі ж мой муж. Амаль да 2000-х гадоў дапамагала мужу працаваць як ІП, нават у дэкрэце. Вось так разам і гадавалі малых. Пасля нараджэння чацвёртага дзіцяці я ўвогуле вырашыла сысці з работы, бо катастрафічна не хапала часу. Быў у мяне невялікі перыяд паміж дэкрэтнымі, калі я пайшла на работу ў дзіцячы садок на некалькі месяцаў. Але гэта не заробак. Як выжывалі? Лёгка нам не было. Часта сям'я карысталася дапамогай грамадскіх арганізацый... А потым старшыя дзеці пайшлі працаваць, стала значна лягчэй. Сёння я на пенсіі — ужо амаль тры гады. Афіцыйны працоўны стаж — 20 гадоў. Дарэчы, на пенсію я сышла раней, чым выйшла з дэкрэтнага водпуску *(смяецца)*. Калі большасць дзяцей сталі самастойныя, я пачала займацца грамадскай дзейнасцю. Наша арганізацыя дапамагае шматдзетным і прыёмным сем'ям. Прадуктамі, адзеннем, робім рамонты, дапамагаем дзецям атрымаць дадатковую адукацыю, арганізоўваем розныя конкурсы для сем'яў... Асноўны наш рэсурс — самі шматдзетныя і прыёмныя сем'і. Яны і дапамагаюць адзін аднаму. Як ніхто іншы, гэтыя людзі разумеюць важнасць такой дапамогі, бо ведаюць, што цяжкія перыяды могуць здарыцца ў любых сем'ях. Калі б была магчымасць вярнуцца ў мінулае, то, нягледзячы на ўсе цяжкасці, я нічога не змяніла б. У нас вялікая, добрая і дружная сем'я, дзе звычайна дапамагаюць адзін аднаму. Нашы дарослыя дзеці зараз клапоцяцца пра нас нават у фінансавым плане. Іншымі словамі, пажынаем, што пасеялі.

Кожная сям'я так ці інакш сутыкаецца з падобнымі праблемамі. Аднак шматдзетныя больш рызыкуюць апынуцца па-за межамі якаснага жыцця. Але пакуль у жанчын ёсць упэўненасць у сваім выбары, яны пераадольваюць цяжкасці. Галоўнае, каб яны ўсё ж паспявалі падняць галаву і падумаць: «Добра тое, што я раблю».

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# ЯК У ДЭКРЭЦЕ БЯСПЛАТНА АТРЫМАЦЬ ПРАФЕСІЮ

### Трэніроўкі па... гутарках

У **Анастасіі Сачак** вышэйшая юрыдычная адукацыя. Але так атрымалася, што пастаянную работу да нараджэння дзіцяці яна знайсці не змагла. І, калі сядзела дома з малым, задумалася над тым, каб пашырыць свае навыкі. Пра курсы ад службы занятасці пачула па радыё і запісалася на «Аўтаматызацыю бухгалтарскага ўліку ў праграме 1С: Бухгалтэрыя».

— Усюды патрэбны такі спецыяліст, — тлумачыць жанчына, чаму спынілася менавіта на гэтай прафесіі. — Таксама цяпер шмат арганізацый, якія займаюцца бухгалтарскімі паслугамі на заказ для іншых прадпрыемстваў.

Курсы разлічаны на месяцах. Ухіл на практыку — на занятках ты адразу працуеш у праграме 1С. Яшчэ адзін плюс — кантакты выкладчыкаў, з якімі і пасля навучання можна будзе пракансультавацца па асобных пытаннях.

Прыглядаць за дзіцем дапамагала бабуля. Але калі ў яе не атрымлівалася, Анастасія брала чатырохмесячнага малога з сабой на заняткі. «Вядома, на мяне спачатку вылуплялі вочы. Але дзіця нікому не перашкаджала — яно спакойна спала».



Анастасія САЧАК.

Выдзяліць час на самаадукацыю для жанчыны было нескладана. Жартуе, што тыя гадзіны, якія некаторыя мамы трацяць на мыццё да бляску кватэры, яна праводзіла за чытаннем канспектаў.

Акрамя таго што курсы бясплатныя (па словах Анастасіі, такія ж прыватныя каштуюць каля 400 рублёў), можна атрымліваць стыпендыю. «Яна невялікая (у мяне рублёў 17 было), але на пачак памперсаў хопіць». Дапамогі па доглядзе дзіцяці ў гэты перыяд таксама не пазбаўляюць.

На работу жанчына пакуль не выйшла — яе малому яшчэ паўтара года. Але свой дэкрэт мінчанка вырашыла правесці максімальна карысна.

— Стараюся адаптаваць сына да дзіцячага садка (ён пайшоў туды некалькі месяцаў таму), каб потым, калі яму споўніцца тры гады, не рваць сабе валасы на галаве і спакойна працаваць. Я спачатку хвалявалася, што рана адпраўляю малога ў садок. А потым зразумела, што жанчыны, якія працуюць там, ужо па 30 гадоў займаюцца маленькімі дзецьмі, і ў іх вопыту нашмат больш, чым у мамы, якая нарадзіла першынца.

Анастасія ўжо нагледзела іншыя цікавыя курсы — па падрыхтоўцы інспектара па кадрах і спецыяліста па арганізацыі закупак. Не выключае, што пазней запішацца на які-небудзь з іх, каб больш упэўнена адчуваць сябе на рынку працы. Хоць на некаторыя вакансіі яна ўжо цяпер можа прэтэндаваць — напрыклад, работа за касай, улік заробку. Аплата па іх — 500—600 рублёў.

— Я вывучаю рынак, нават хаджу на гутаркі — проста трэніруюся. Рыхтуюся загадзя, пакуль у мяне ёсць час, — тлумачыць жанчына свой падыход.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Фота з гісторыяй

# Беражыце сямейны альбом

**Напярэдадні дня памяці каго-небудзь з блізкіх, як звычайна, звяртаюся да сямейнага альбома, дзе ўсе родныя, якіх ужо няма на зямлі, паўстаюць перад вачыма жывыя і маладыя... Здаецца, нічога асаблівага ў іх лёсах, але ўсё ж такі — адлюстраванне часу, у якім яны жылі.**

Вось, напрыклад, бацька мой, Фядос Аксёнавіч Раманоўскі, народжаны ў 1926 годзе, рос у вялікай сям'і, дзе ў пашане былі навукі, дзе клапаціліся аб выхаванні дзяцей. Жылі яны на Магілёўшчыне, у вёсцы Дзерамёнка Клімавіцкага раёна. Як усе мясцовыя дзеці, хлопчык вучыўся ў Красавіцкай школе, дапамагаў дарослым па гаспадарцы. Разам з бацькам сваім даглядаў калгасных коней, асаблівая цікаўнасць да якіх перадалася яму ад дзядулі, што быў некалі панскім канюшым (па тым часе гэта спецыяліст па развядзенні і гадоўлі коней). А яшчэ Федзя вельмі любіў маляваць, марыў стаць мастаком.



Хадора і Фядос (канец 40-х гадоў мінулага стагоддзя).



Падчас вучобы ў тэхнікуме (Фядос Раманоўскі ў цэнтры. 1946 год).

Старэйшая за яго на 10 гадоў сястра Хадора была актывісткай, уступіла ў партыю, а ў перадваенныя гады яе абралі старшынёй калгаса. Падчас акупацыі яна знаходзілася далёка ад дому, у эвакуацыі, бо выконвала загад дзяржавы аб захаванні калгасных статкаў жывёлы.

Вялікая Айчынная перакрэсліла ўсе задумкі 14-гадовага падлетка. Вёску захапілі ворагі, там пачалі гаспадарыць паліцаі. Аднойчы яны затрымалі групу мясцовых хлопцаў, у якой быў і Фядос, абвінавацілі ў тым, што тыя збіраюць зброю, і прылюдна жорстка высеклі. Вось тады прыйшло канчатковае рашэнне падацца да партызанаў. Пайшоў з дому ў лес і з той пары да самага вызвалення раёна служыў у партызанскай брыгадзе пад камандаваннем Сяргея Акімавіча Мазура ў якасці разведчыка. Брыгада дзейнічала на мяжы Клімавіцкага, Касцюковіцкага, Краснапольскага і Чэрыкаўскага раёнаў. Дробнаму хударляваму хлопчыку прасцей было праслізнуць незаўважаным на варожую тэрыторыю, каб сабраць каштоўныя звесткі для камандавання. Удала выконваў адказныя даручэнні, за што потым быў узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «Партызан Айчыннай вайны» 2 ступені, «За перамогу над Германіяй».



Былы разведчык, ветэран (80-я гады мінулага стагоддзя).

Пасля вайны скончыў Клімавіцкі зоаветэрынарны тэхнікум. Працаваў ветфельчарам спачатку на Палессі, затым — на роднай Клімаўшчыне. Лячыў жывёлу, а ў свабодную хвіліну браў у рукі пэндзаль з фарбамі і ствараў, як умеў, свае палотны, і тыя служылі ў доме замест дываноў. Яркі ўспамін майго дзяцінства — гэта маляваны белы палац над возерам у раме з прыгожых кветак. Пэўна, нездарма мы, усе пяцёра яго дзяцей, выраслі неабыякавымі да мастацтва, за што бясконца ўдзячны дарагому чалавеку.

**Таццяна ІГНАЦЕНКА.**

Мама, пачытай!

# ПАДАРУНАК ДЗЕДУ МАРОЗУ

На календары красавалася трыццатага снежня. Да нас павінны былі завітаць Дзед Мароз са Снягуркай. Вершык для гасцей я прыгатавала. Але падумала — гэтага мала. Усё ж я ўжо не маленькая — вучаніца 5 класа.

У пакоі я агледзела свае цацкі. Разгубілася, што з іх выбраць, каб падарунак быў памятны? Але нічога не нагледзела. Узяла альбомны ліст і алоўкі. Пайшла з імі на кухню. Мне захацелася намаляваць зімовы пейзаж.

У дзверы патэлефанавалі нечакана. Мы з бацькамі чакалі казачных персанажаў пазней. Я пабегла адчыняць. На парозе стаялі Дзед Мароз і Снягурка.

— Добры дзень таму, хто ў гэтым даму! — сказаў весела Дзед Мароз. — Мы з унучкай прыйшлі павіншаваць вас з Новым годам! Тут жыве дзяўчынка Насця?

— Гэта я! — адказала я.

— Праходзьце, праходзьце, — запрасіла чароўных гасцей у кватэру мама. — Распранайцеся — і да нашага стала! Пачастуем вас гарбатай з тортам.

Казачныя героі хацелі адмовіцца. Маўляў, іх чакаюць і іншыя дзеці. Але тата запярэчыў:

— І слухаць не будзем. Не адпусцім, пакуль не пачастуецеся ў нас!

Госці прайшлі на кухню, дзе мама ўжо паставіла на стол гарбату і торт. Мы дружна селі за стол і пачалі частавацца.

— Ну, Насця, павесяліце старога чалавека і яго ўнучку, — прамовіў Дзед Мароз. — Пакажыце, як вы ўмееце вершы чытаць ці спяваць, танцаваць. А мы са Снягуркай паслухаем ды і адпачнем з дарогі.

Я расказала гасцям вершык.

— Ну дзякуй, Настачка, павесяліла ты нас, — пахваліў мяне стары. — А вось разгадай цяпер нашы загадкі. Што плача без слёз?

— Снег, — падумаўшы, адказала я.

— А цяпер мая чарга задаваць загадку, — сказала Снягурка. — Што без ног ідзе?

— Дождж, — здагадалася я.

— Ну і яшчэ адна табе загадка ад мяне, — прамовіў Дзед Мароз. — Што без вады плавае?

— Аблокі! — адказала я.

— Малайчына, — пахвалілі мяне казачныя персанажы.

— Дазвольце і ў вас запытацца, — сказала я і зірнула на казачных герояў. — Які падарунак быў для вас самы памятны ў дзяцінстве?

Казачныя героі пераглянуліся. Здаецца, яны не былі гатовыя да такога пытання.

— Калі мне было пяць гадоў, мне падарылі Снегавіка, — сказаў Дзед Мароз. — Я і зараз з ім неразлучны. Ён прыглядае за домам, калі я адсутнічаю — віншую дзяцей.

— А маім найлепшым падарункам была вязаная Сняжынка, — адказала Снягурка. — Такая ёсць толькі ў мяне. І мы з ёй сябруем да сёння.

А я прыгадала мядзведзяня, якога падарылі, калі мне было чатыры гады.

— Гэта мой самы любімы падарунак. Мы таксама будзем з ім сябраваць заўсёды, — падзялілася я таямніцаю з гасцямі.

— Вельмі добра, — узрадаваўся Дзед Мароз. — Ніколі не трэба забывацца на свае найлепшыя падарункі і мяккія цацкі, якія вам падарылі ў дзяцінстве. А то яны могуць пакрыўдзіцца...

З чароўнымі гасцямі мы сядзелі, мабыць, гадзіну. Успаміналі свае дзіцячыя мары, падарункі, і нам ад гэтага было добра і весела.

Ужо калі Дзед Мароз і Снягурка апрануліся і збіраліся выходзіць, я працягнула ім малюнак, які незаўважна малявала за сталом падчас бяседы.

На малюнку былі я, бацькі і казачныя героі. А яшчэ я дамалявала Снегавіка і Сняжынку, быццам яны таксама былі з намі. Мы разам пілі гарбату, а пасярод стала стаяў вялікі торт.

**Андрэй СІДАРЭЙКА.**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

## НАВАГОДНЯЕ ІМБІРНАЕ ПЯЧЭННЕ

*__Спатрэбіцца:__ 300 г пшанічнай мукі, 100 г размякчанага масла, 100 г цукру (лепш карычневага), 2 ст. л. вадкага мёду, 1 ч. л. молатага імбіру, 1 ч. л. молатай карыцы, 0,5 ч. л. молатай гваздзікі, 1 ч. л. разрыхляльніка для цеста, 1 ст. л. парашка какава (калі жадаеце, каб пячэнне было цёмным), 1 вялікае яйка. Для глазуры: цукровая пудра — 250 г, бялок вялікага яйка — 1 шт, лімонны сок — 1 ст. л, цёплая вада — 2-3 ст. л., харчовыя фарбавальнікі (па жаданні).*



Масла нарэжце кубікамі, злучыце з цукрам, якім — павінна атрымацца аднародная маса. Дадайце муку, соду, спецыі, імбір і какава. Змяшайце. Загарніце цеста ў харчовую плёнку і пастаўце на паўгадзіны ў халадзільнік. Пакладзіце частку цеста на вялікі ліст пекарскай паперы, прыцісніце рукой, накрыйце яшчэ адным лістом і раскачайце качалкай. Павінен атрымацца роўны слой таўшчынёй не больш за 5 мм. Разагрэйце духоўку да 180 градусаў. Засцяліце бляху паперай для выпечкі. Зрабіце з цеста фігуркі (пратканіце саломінкай дзірачкі для тасьмы), выкладзіце іх на бляху і адпраўце ў духоўку на 5—7 хвілін. Тое ж самае зрабіце з астатнім цестам. Дайце гатоваму пячэнню астыць і распачынайце ўпрыгожванне. Злучыце ўсе інгрэдыенты глазуры, узбіце міксерам на працягу 8—10 хвілін. Павінна атрымацца шчыльная глянцавая маса. Правядзіце па глазуры нажом, яна павінна трымаць след каля 10 секундаў — такой глазурай зручна маляваць. Калі глазура занадта вадкая, дадайце яшчэ цукровай пудры. Калі, наадварот, вельмі густая, уліце сталовую лыжку цёплай вады. Калі хочаце атрымаць рознакаляровую глазуру — дадайце харчовыя фарбавальнікі. Затым перакладзіце ў кандытарскі мяшок і бярыцеся за ўпрыгожванне. Гатовае пячэнне пакіньце на 3—4 гадзіны, каб глазура застыла. Захоўвайце пячэнне ў кантэйнеры са шчыльнай накрыўкай.

УМЕЛЫЯ РУЧКІ

## РЫХТУЕМ ВІНШАВАННІ

**Паштоўкі з бульбяным прынтам**







Гэты мілы прынт атрымліваецца, калі абмакнуць у звычайную гуаш палову бульбы. А астатняе трэба будзе падмаляваць, калі фарба высахне.



**Яловая галінка**

Дух і водар Новага года перадасць паштоўка з сапраўднай яловай галінкай. Тут і гузікі прыдадуцца.

**Чорна-чырвона-белы мінімалізм**



Для таго каб стварыць гэтыя цудоўныя паштоўкі, вам спатрэбяцца толькі чорная ручка, чырвоныя гузікі і... добры ўзор перад вачыма.

*«НЕ СЛУХАЎ МАЛЫ, НЕ ПАСЛУХАЕ І ВЯЛІКІ» (Беларуская прыказка).*

# І СТАНЕ НАШ ГОРАД БОЛЬШ ЧЫСТЫМ

## Рэалізацыя трох ініцыятыў праекта ПРААН па зялёным горадабудаўніцтве значна скароціць выкіды $CO_2$

**Згодна з глабальным парадкам устойлівага развіцця краіны, прадугледжана неабходнасць зрабіць гарады і населеныя пункты адкрытымі, бяспечнымі і жыццеўстойлівымі. На дасягненне гэтай мэты накіраваны праект, які фінансуецца Глабальным экалагічным фондам і рэалізуецца ў партнёрстве з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя ў 2016—2021 гадах.**

Адным з галоўных кампанентаў праекта «зялёных» гарадоў з'яўляецца рэалізацыя пілотных ініцыятыў па ўстойлівым гарадскім транспарце ў Полацку і Наваполацку і мерапрыемстваў па павышэнні энергаэфектыўнасці ў Навагрудку. Чакаецца, што іх вынікам стане сукупнае прамое скарачэнне выкідаў $CO_2$ на 91,1 тысячы тон за гады праекта.

### Не проста мара

**Начальнік галоўнага ўпраўлення экалагічнай палітыкі, міжнароднага супрацоўніцтва і навукі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Наталля ЖАРКІНА** адзначыла, што зялёны горад павінен стабільна задавальняць патрэбнасці некалькіх пакаленняў. Ён павінен рабіць свой важкі ўклад у эканоміку і пры гэтым скарачаць выкіды парніковых газаў. Гэта асабліва актуальна ва ўмовах, калі 70 % насельніцтва краіны пражывае менавіта ў гарадах, пераважна — з колькасцю 100 тысяч і больш чалавек.

Таму ў нас распрацоўваецца інтэграваны падыход, накіраваны на павышэнне ўстойлівасці населеных пунктаў за кошт энергазберажэння, развіцця транспарту і гарадской мабільнасці. Ажыццяўляюцца і іншыя меры, якія выгадныя для эканомікі, карысныя для навакольнага асяроддзя і паляпшаюць якасць жыцця людзей. «Зялёныя» гарады — гэта ўжо не мара, а рэальнасць. Але нас чакае яшчэ вельмі шмат працы, у тым ліку па карэкціроўцы заканадаўства, кааперацыі намаганняў органаў улады, грамадскасці, насельніцтва», — заўважыла Наталля Жаркіна ў прэс-цэнтры БелТА.

### Праблема з паветрам і не толькі

«За кошт удасканалення гарадскога транспарту і развіцця веларуху мяркуецца скараціць выкіды вуглякіслага газу на 77,8 тысячы тон, астатняе — за кошт энергаэфектыўных мерапрыемстваў», — падзялілася **кіраўнік праекта Ірына УСАВА.**

Наваполацк, як вядома, характарызуецца не самымі лепшымі паказчыкамі чысціні паветра. «Паўплываць на сітуацыю з дапамогай праекта мы можам толькі ў рамках транспартнага кампанента. Умешвацца ў планы работы прадпрыемстваў «Нафтан» і «Палімір» мы не можам. Але яны таксама шмат чаго робяць, каб скараціць выкіды забруджвальных рэчываў у атмасферу. Акрамя таго, спецыяльнае даследаванне, праведзенае пад эгідай Мінпрыроды, паказала, што мабільныя крыніцы з'яўляюцца асноўным забруджвальным фактарам у Наваполацку», — дадала кіраўнік праекта ПРААН.

Распрацоўць таксама візуальныя карты, з дапамогай якіх у тым ліку можна будзе ацаніць скарачэнне выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасферу ў выніку рэалізацыі ініцыятыў.

### Ад тэорыі да практыкі

«Сёлета мы больш рабілі ўпор на тэарэтычны блок праекта. Таму што падыходы ў фарміраванні гарадскіх тэрыторый — гэта аснова. Эксперты прааналізавалі існуючыя сусветныя практыкі і распрацавалі рэкамендацыі на нацыянальным узроўні. Падрыхтавалі аналітычныя агляды, якія ўключаюць пашпарты, профілі і звесткі аб стане пілотных гарадоў па дзесяці асноўных кампанентах. Для ўсіх трох населеных пунктаў распрацаваны і планы зялёнага горадабудаўніцтва — пакрокавыя стратэгіі па дасягненні жаданага стану горада.

Створаны каардынацыйныя групы па рэалізацыі праекта. Шмат увагі аддавалася ўключэнню насельніцтва ў абмеркаванне ініцыятыў. Праведзена апытанне для выяўлення праблем, на якія ўказалі самі жыхары. Цяпер мы пераходзім да практычнай часткі і маніторынгу, які дазволіць па кожным запланаваным мерапрыемстве адказаць на шэраг пытанняў: што гэта дасць гораду, колькі будзе каштаваць, як дазволіць знізіць выкіды $CO_2$ і наколькі рашэнне ўпісваецца ў рамкі нацыянальнага заканадаўства. Важным момантам стане і вызначэнне крыніц фінансавання», — адзначыла Ірына Усава.

Акрамя таго, завершана распрацоўка тэхніка-эканамічных абгрунтаванняў, што дапамогуць зразумець, якія тэхналогіі можна ўжываць у пілотных гарадах для большага эфекту. Падрыхтавана серыя адкрытых картаграфічных матэрыялаў — яна ўключае звесткі па стане жыллёвага фонду, якасці забудовы, размеркаванні шчыльнасці насельніцтва, зялёных тэрыторый, даступнасці прыпынкаў грамадскага транспарту і іншых аб'ектаў гарадской інфраструктуры. Усяго падрыхтавана 20 электронных карт для кожнага пілотнага горада, размясціць якія плануецца ў адкрытым доступе.

### Веладарожка паміж гарадамі

Згодна з праектам у Полацку і Наваполацку зроблены акцэнт на гарадскую мабільнасць. Там ужо завяршаецца падрыхтоўка тэхнічнага задання і хутка будзе праведзены тэндар на стварэнне праектна-каштарыснай дакументацыі па будаўніцтве веладарожкі, якая звяжа два гарады. Да гэтага былі разгледжаны розныя варыянты маршрутаў, у выніку выбраны аптымальныя, які пралягае праз вёску Экімань.

Мяркуецца дадаткова развіваць веласіпедную сетку гэтых гарадоў. Патрэбныя новыя веладарожкі, велапаркоўкі, велакафэ, рамонтныя майстэрні і пункты пракату. Таксама праектам запланаваны замена прыпынкаў грамадскага транспарту і ўстаноўка інфармацыйных табло. Неабходна стварыць роўныя ўмовы перамяшчэння для ўсіх гарадскіх жыхароў, у тым ліку для сацыяльна ўразлівых груп і людзей з інваліднасцю. І ўпершыню для двух гарадоў у Беларусі распрацоўваецца адзіны план устойлівай гарадской мабільнасці. Гэтым займаецца каардынацыйная група. План дазволіць Полацку і Наваполацку сумесна вырашаць рэгіянальныя праблемы запатрабаванасці грамадскага транспарту, перагружанасці дарог з-за празмернага выкарыстання асабістых аўтамабіляў.

### Хітрае асвятленне і «разумны» дом

Па праекце ў Навагрудку будзе праведзена замена неэфектыўных ліхтароў «разумнымі» святлодыёднымі свяцільнямі і ўкараненне сістэмы інтэлектуальнага ўліку энергарэсурсаў на аб'ектах жылога фонду. Сістэмы кантролю вулічнага асвятлення ўлічваюць наяўнасць або адсутнасць людзей і транспарту, мяняюць асветленасць у розны час сутак, тым самым эканомячы электраэнергію і грошы.

Да таго ж Ірына Усава адзначыла, што Навагрудскі гарвыканкам узгадніў пілотны энергаэфектыўны дом, які кіруецца таварыствам уласнікаў. У ім плануецца ўсталяваць разумныя лічыльнікі, але гэта яшчэ трэба ўзгадніць з усімі жыхарамі, з якімі будзе праведзена адпаведная інфармацыйная і адукацыйная работа.

**Сяргей КУРКАЧ.**



Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Калинковичский мясокомбинат», Гомельская обл., г. Калинковичи, ул. Северная, 8 |

**Предмет аукциона**
**Месторасположение: Гомельская обл., Калинковичский р-н, Липовский с/с, аг. Липов, ул. Советская, 26**

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|
| **Здание комплексного приемного пункта** | 161,4 кв. м | 333/С-24121 |

**Сведения о земельном участке**: пл. **0,0415 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания комплексного приемного пункта

**Начальная цена с НДС 20 % – 4 848,22 бел. руб.,**
(снижена на 70 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30** (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 10.11.2018

**Аукцион состоится 30.01.2019** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 28.01.2019** до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. www.cpo.by**. E-mail: auction@cpo.by**

**Антикризисный управляющий Правовая компания «БелПрофКонсалт» объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества СООО «НТС» (дата торгов: 21.12.2018, 12.00), ООО «Вазсервис-С» (дата торгов: 11.01.2019 в 10.00), ООО «Викди-М» (дата торгов: 04.01.2019, 10.00)**

Место проведения торгов: г. Минск, пр-т Победителей, 127, оф. 312.

Подробная информация о дате, времени и порядке проведения торгов, предлагаемых к продаже лотах, начальной цене и размере задатков, продавце и организаторе, иная информация, требуемая в соответствии с законодательством, размещены в Едином государственном реестре сведений о банкротстве: http://bankrot.gov.by. УНП 100999265

Утерянные квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) в количестве 4 шт., форма 1СУ серии СВ № 2557877–2557880; страховые полисы обязательного страхования гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь в количестве 11 шт., серия ВВ № 5492900–5492910 в представительстве Белгосстраха по Молодечненскому району **считать недействительными.**
УНП 10022726

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении открытого аукциона

**Лот № 1.** Право заключения договора аренды помещений общей площадью 46,52 кв. м, в т. ч. основная площадь – 38,12 (23,09; 15,03) кв. м и вспомогательная площадь – 8,4 (2,09; 6,31) кв. м, расположенных на первом этаже капитального строения с инв. № 710/С-52545 (здание отделения почтовой связи № 26), по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Чонгарская, д. 63. Право аренды предоставляется сроком на пять лет.
**Начальная цена продажи: 187,36 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 18,74 бел. руб.**

**Аукцион состоится 15 января 2019 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Последний день подачи заявок и внесения задатка: 14 января 2019 года до 15.00. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее чем за три дня до даты аукциона

**Расчетный счет для внесения задатка:** получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182,
р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Продавец:** Могилевский филиал РУП «Белпочта, УНП 700838286, г. Могилев, ул. Первомайская, 28

**Организатор аукциона:** Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, тел. +375 222 72-41-14

**Порядок проведения аукциона:** для участия в аукционе приглашаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, которые внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, своевременно подали заявление на участие в аукционе со всеми необходимыми документами, заключили с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон. Лоты продаются без условий на открытом аукционе с применением метода повышения начальной цены, с шагом пять процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Единственный участник имеет право приобрести объект продажи по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона уплачивает затраты за организацию и проведение аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона в соответствии со счетом-фактурой. В течение 5 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона Победитель перечисляет на расчетный счет Продавца цену продажи предмета аукциона за вычетом задатка. Задаток, внесенный для участия в аукционе Победителем аукциона, засчитывается в счет уплаты за предмет аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня оплаты предмета аукциона подписать договор аренды помещений

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: +375 44 767-65-36, +375 29 624-26-25**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Совместного белорусско-австрийского закрытого акционерного общества «Гомельский стеклотарный завод» (продавец) в лице управляющего в деле о банкротстве – ИП Яцына И. В. извещает о проведении 28 декабря 2018 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Изолированное помещение с инв. № 350/D-182539** (инв. № 101012), **площадью 4 217,5 кв. м**, назначение – производственное помещение, наименование – **производственное помещение**. Местонахождение: **Гомельская обл., г. Гомель, ул. Лепешинского, 7-4.** Информация о земельном участке: расположен на земельном участке с кадастровым номером **340100000002003191** общей площадью **3,5631 га (право аренды, доля в праве 2/5).** Внутризаводская асфальтобетонная площадка 1451 площадью **662,8 кв. м** (инв. № 101007) | **329 130,00** | 16 456,50 | 16 456,50 |
| 2 | **Пила настольная CEDIMA CTS-175/1, Германия** (инв. № 2261) | **2 340,00** | 117,00 | 117,00 |
| 3 | **Прицеп самосвальный тракторный, модели 2ПТС-6** (инв. № 1432) | **2 790,00** | 139,50 | 139,50 |
| 4 | **Дебиторская задолженность ЧТУП «Стош»** (УНП 490556116) | **1 120,28** | 56,01 | 56,01 |
| 5 | **Дебиторская задолженность ООО «Балтранс»** (УНП 101278078) | **1 350,00** | 67,50 | 67,50 |
| 6 | **Дебиторская задолженность СЗАО «АТЕС»** (УНП 190475703) | **1 968,25** | 98,41 | 98,41 |
| 7 | **Дебиторская задолженность СЗАО «Дрим маркетинг»** (УНП 191007752) | **67,90** | 3,40 | 3,40 |

**Продавец:** СЗАО «Гомельский стеклотарный завод», Гомельская обл., Гомельский р-н, р. п. Костюковка, ул. Гомельская, д. 25, ком. 2. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (029) 653-92-88 – управляющий в деле о банкротстве ИП Яцына Игорь Валерьевич. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); 2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 13 декабря 2018 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 26 декабря 2018 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов). Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за пять дней до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником**, объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст. 127–129. **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 30.10.2018 г. № 209 (28825). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

# Извещение о проведении электронных торгов

## Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» 17 января 2019 г. в 11.30 на электронной торговой площадке «МИНСК – НЕДВИЖИМОСТЬ» (http://minskestate.by/) проводит электронные торги по продаже права заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске. Предмет электронных торгов: право заключения договора аренды земельного участка сроком на 5 лет

| № предмета аукциона | Месторасположение земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь, га | Целевое назначение земельного участка / назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества | Начальная цена предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, рублей | Отдельные условия, предусмотренные в решении Мингорисполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона и иные условия аукциона |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | г. Минск, ул. Лидская | 500000000006009210 | 0,3300 | Для строительства объекта «Торгово-обслуживающий объект по ул. Лидской в г. Минске» / земельный участок для размещения объектов иного назначения | 83 570,45 | 12 500,00 | 10 632,92 | проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: состав объекта строительства – помещения торгово-бытового назначения, предприятия общественного питания;<br>показатели по вместимости объекта строительства – до 3600 кв. м общей площади |
| 2 | г. Минск, ул. Вязынская | 500000000006009198 | 0,6500 | Для строительства объекта «Объект торгово-бытового обслуживания по ул. Вязынская в г. Минске» / земельный участок для размещения объектов иного назначения | 128 652,23 | 19 200,00 | 8 368,28 | проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: функциональное назначение земельного участка и его частей – для строительства объекта торгово-бытового обслуживания по ул. Вязынская в г. Минске, состав объекта строительства – торговые объекты, объект бытового обслуживания населения, объекты общепита;<br>показатели по вместимости объекта строительства – общая площадь – до 1500 кв. м, объект бытового обслуживания – не менее 100 кв. м |
| 3 | г. Минск, ул. Каменногорская | 500000000006009136 | 0,5800 | Для строительства объекта автосервиса по ул. Каменногорской в г. Минске / земельный участок для размещения объектов иного назначения | 137 672,77 | 20 700,00 | 10 309,22 | проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: состав объекта строительства – СТО на 5 постов, автомойка на 4 поста, помещения коммунально-обслуживающего назначения; помещения торгово-бытового назначения (не более 35 % общей площади объекта); показатели по вместимости объекта строительства – до 3000 кв. м общей площади;<br>возмещение Минскому районному унитарному предприятию «Агрокомбинат «Ждановичи» убытков сельскохозяйственного производства в сумме 1 178,79 руб.;*<br>возмещение потерь сельскохозяйственного производства в сумме 15 449,11 руб., с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения* |
| 4 | г. Минск, ул. Якубовского | 500000000006009162 | 0,1625 | Для строительства объекта «Кафе по ул. Якубовского в г. Минске» / земельный участок для размещения объектов общественного питания | 73 629,65 | 11 000,00 | 9 889,47 | проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: функциональное назначение объекта – для строительства кафе, состав объекта: кафе, вместимость объекта строительства – общая площадь здания до 1000 кв. м;<br>возмещение потерь лесохозяйственного производства в сумме 285,19 руб., с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения* |

* Убытки и потери сельскохозяйственного и лесохозяйственного производства подлежат пересчету с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения.

**Продавец:** Минский городской исполнительный комитет, пр-т Независимости, 8, 220030, г. Минск, сайт: www.minsk.gov.by.

**Организатор электронных торгов и оператор электронной торговой площадки:** коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск, телефоны: (017) 2261672, 327-40-22, сайт: www.mgcn.by.

**Порядок проведения электронных торгов:** электронные торги проводятся в соответствии с **регламентом** информационной торговой системы ЭТП «МИНСК – НЕДВИЖИМОСТЬ» (далее – Регламент) с соблюдением требований Положения о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 (далее – Положение).

**Для участия в электронных торгах необходимо** ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на сайте ЭТП по электронному адресу **http://minskestate.by**, пройти аккредитацию на ЭТП, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

**Задаток** перечисляется на расчетный счет № BY34BPSB30121049710199330000 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску и Минской области, БИК BPSBBY2X, 220035, г. Минск, пр-т Машерова, д. 80, УНП 190398583, получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» (задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению) не позже срока окончания приема документов на участие в электронных торгах **– 14 .01.2019 г.**

Дата и время начала проведения электронных торгов**: 17 января 2019 года в 11.30** (по времени на сервере ЭТП «МИНСК – НЕДВИЖИМОСТЬ»).

**Победитель** электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, выразивший согласие на приобретение земельного участка по начальной цене, увеличенной на 5 % (претендент на покупку), в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах электронных торгов либо признания торгов несостоявшимися до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка обязан:

– внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

– возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

– возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

– выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком на основании решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и протокола о результатах аукциона либо протокола о признании аукциона несостоявшимся заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона **договор аренды земельного участка сроком на 5 лет**.

**Размер штрафа, уплачиваемого участником электронных торгов и (или) их победителем (претендентом на покупку) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет:**

по земельному участку для строительства объекта «Торгово-обслуживающий объект по ул. Лидской в г. Минске» – **12 500,00 бел. руб.** (двенадцать тысяч пятьсот тридцать пять белорусских рублей);

по земельному участку для строительства объекта «Объект торгово-бытового обслуживания по ул. Вязынская в г. Минске» – **19 200,00 бел. руб.** (девятнадцать тысяч двести белорусских рублей);

по земельному участку для строительства объекта автосервиса по ул. Каменногорской в г. Минске – **20 700,00 бел. руб.** (двадцать тысяч семьсот белорусских рублей);

по земельному участку для строительства кафе по ул. Якубовского в г. Минске – **11 000,00 бел. руб.** (одиннадцать тысяч белорусских рублей).

**Прием заявлений** на участие в электронных торгах с прилагаемыми документами осуществляется по **14.01.2019 г.** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 2, тел. (017) 2261672.

Детальная информация о порядке участия в электронных торгах размещена на сайте ЭТП «МИНСК – НЕДВИЖИМОСТЬ» **( http://minskestate.by)**

Zамор'е

## Самаму багатаму блогеру — 7 гадоў

**Самым высокааплатным YouTube-блогерам у свеце стаў аўтар канала Ryan ToysReview, сямігадовы хлопчык па імені Раян. Ён праславіўся аглядамі дзіцячых цацак. Рэйтынг самых багатых прадстаўнікоў відэахостынгу апублікавала выданне Forbes.**



У перыяд з 1 чэрвеня 2017 года да пачатку лета 2018-га Раян зарабіў 22 мільёны долараў, паводле разлікаў партнёраў і рэкламадаўцаў. Усяго на канал Ryan ToysReview падпісана 17 мільёнаў чалавек. Другое месца ў рэйтынгу самых высокааплатных блогераў заняў малодшы брат вядомага блогера Логана Пола па імені Джэйк. За апошні год ён атрымаў 21,5 мільёна долараў. Карыстальнікі прагледзелі яго ролікі больш за 3,5 мільярда разоў. Сам Логан Пол за мінулы год зарабіў «усяго» 14,5 мільёна долараў і трапіў на апошні (дзясяты) радок рэйтынга. Гэта звязана з тым, што адміністрацыя YouTube абмежавала супрацоўніцтва з ім у выніку скандалу, што адбыўся пасля публікацыі відэа з целам чалавека, які здзейсніў суіцыд.

## Шатландка пахудзела з-за «пачварнага» світара

**52-гадовая Фіёна Эдні скінула 38 кілаграмаў уласнай вагі пасля таго, як вымушаная была надзець «пачварны» калядны світар, бо іншыя на яе не налазілі, піша The Mirror.**



Два гады таму на дзень калядных світараў — гэта дабрачынная акцыя традыцыйна ладзіцца ў Шатландыі ў снежні — Фіёна Эдні, якая важыла на той момант 114 кілаграмаў, прыйшла на працу ў світары памеру XXXL. «Выглядала я проста жахліва. На ім быў робат, бо мне давялося набыць яго ў мужчынскім аддзеле», — успамінае жанчына, якая вельмі перажывала з-за свайго выгляду. Світар, у якім Фіёна вымушаная была пайсці яшчэ і на калядную вечарынку да сяброў, стаў апошняй кропляй, якая падштурхнула да пахудзення.

Сёння жанчына, якая пахудзела на трэць, носіць вопратку памеру M і строга выконвае рэкамендацыі дыетолагаў: замест паўфабрыкатаў, мучнога і салодкага перайшла на нятлустае мяса, супы, салаты і свежую агародніну, але не выкідвае «пачварны» світар, які дапамог ёй кардынальна змяніць жыццё.

## Карціну з барахолкі перапрадалі ў 400 разоў даражэй

**Жыхар Нідэрландаў прадаў з аўкцыёну палатно знакамітага майстра, якое набыў за бесцань у краме ўжываных рэчаў.**



Як паведамляе UPI, нехта Хенк Лаарманс аддаў за вясковы пейзаж 75 еўра, але западозрыў, што старая карціна з манаграмай «А» ў ніжнім правым куце і латкамі на адваротным баку можа аказацца куды больш каштоўнай, і паказаў яе эксперту тэлеперадачы Tussen Kunst and Kitsch («Паміж мастацтвам і кітчам»). Спецыяліст высветліў, што палатно належыць пэндзлю Ёханеса Аартса — галандскага мастака пачатку XX стагоддзя, чые работы крытыкі часам параўноўваюць з палотнамі Ван Гога. На аўкцыёне, куды ўзрадаваны ўладальнік выставіў свой лот, кошт карціны вырас у 400 разоў і перавысіў 30 тысяч еўра! Апошнюю стаўку зрабіў буйны калекцыянер з Нідэрландаў, які пажадаў застацца невядомым.

**Іван КУПАРВАС.**

Як нас дураць

# МАХЛЯРСТВА НА ДАВЕРЫ

**Як паведамілі ў Следчым камітэце, скончана расследаванне крымінальнай справы аб махлярстве: 28-гадовы раней судзімы ўраджэнец Вілейкі ў перыяд з верасня 2017 года да верасня бягучага года вымаміў грошы і маёмасць у 11 чалавек.**



Мужчына, праяўляючы немалую фантазію, складаў розныя легенды для сваіх знаёмых, каб атрымаць ад іх грашовыя сродкі. Напрыклад, ён казаў пра тое, што яго бацька валодае бізнесам у Нарвегіі. Або расказваў пра цяжкахворую маці (якая на самай справе знаходзіцца ў месцах пазбаўлення волі).

Так, абвінавачаны атрымаў ад знаёмага 300 долараў, паабяцаўшы яму аформіць неабходныя дакументы для працаўладкавання ў фірму яго бацькі ў Нарвегіі, дзе той змог бы атрымліваць вялікую заработную плату.

Таксама мужчына браў грошы ў знаёмых, кажучы, што хоча купіць аўтамабіль ці што-небудзь з нерухомасці. Ахвярамі станавіліся і жанчыны, з якімі ён знаёміўся ў інтэрнэце. Мужчына браў у іх грошы нібыта для аплаты стаматалагічных паслуг, куплі жылля і аўтамабіля. Адна з пацярпелых, напрыклад, паддаўшыся на яго ўгаворы, здавала ў ламбард ювелірныя вырабы, якія мужчына абяцаў выкупіць пазней.

У ходзе расследавання праведзены допыты, вочныя стаўкі з удзелам абвінавачанага і пацярпелых, вывучана змесціва электронных прылад. Былі прааналізаваны звесткі аб тэлефонных перамовах і канфіскаваная дакументацыя, у тым ліку ў банкаўскіх установах і фірме, якая займалася здачай аўтамабіляў у арэнду.

Усяго ўстаноўлена 46 эпізодаў супрацьпраўнай дзейнасці абвінавачанага. Агульная сума шкоды склала больш за 56 тысяч рублёў.

Дзеянні жыхара Вілейкі кваліфікаваны па ч. 4 арт. 209 (махлярства) КК РБ. Да яго прыменена мера стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту. Крымінальная справа перададзена пракурору для накіравання ў суд.

Некалькі іншыя злачынствы, але па тым жа артыкуле, здзяйсняў раней судзімы 49-гадовы ўраджэнец Брэсцкай вобласці ў перыяд з 2016 да 2018 года на тэрыторыі Мінска.

Прадстаўляючыся святаром, пад маркай правядзення абраду асвячэння жылля, ажыццяўлення ахвяраванняў, набыцця царкоўных свечак для правядзення набажэнства, развіцця камерцыйнай дзейнасці — ён завалодаў грашовымі сродкамі грамадзян на агульную суму больш за 49 тысяч рублёў.

Устаноўлена, што мужчына ніколі святаром не быў. Ён выкарыстаў адпаведнае царкоўнае адзенне і начынне, каб лягчэй было ўваходзіць у давер да людзей.

Усяго ўстаноўлена 12 эпізодаў такой злачыннай дзейнасці. Следчымі дапытана больш за 30 чалавек, праведзены вочныя стаўкі паміж пацярпелымі і абвінавачаным, вобыск па месцы жыхарства ілжэсвятара, накладзены арышт на яго маёмасць.

Мужчыну прад'яўлена абвінавачанне па ч. 4. арт. 209 КК РБ. Да яго прыменена мера стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту. Крымінальная справа перададзена пракурору для накіравання ў суд.

**Сяргей КУЛАКОЎ.**

Бяспека

## Лягчэй на паваротах

**Нядаўна ў Бабруйскім раёне непадалёк ад вёскі Баравая адбылася сур'ёзная аварыя: 31-гадовы кіроўца БМВ страціў кантроль над кіраваннем, яго машына выехала на сустрэчную паласу і пратараніла «сітраен». У ДТЗ загінула пасажырка «сітраена». Яшчэ чатыры чалавекі, у тым ліку 15-гадовы падлетак, атрымалі цяжкія траўмы. Вынікі аварыі маглі б быць менш трагічнымі, калі б на колах БМВ стаяла зімовая гума.**

**Начальнік УУС Магілёўскага аблвыканкама Ігар ШЧАРБАЧЭНЯ** нагадвае, што правілы дарожнага руху патрабуюць, каб з 1 снежня да 1 сакавіка на колах машын былі выключна зімовыя шыны. У іншым выпадку кіроўца рызыкуе трапіць пад адміністрацыйную адказнасць і атрымае папярэджанне або заплаціць штраф ад 0,5 да 1 базавай велічыні, а ў паўторным выпадку да 2—5 базавых велічынь. Пакрышка павінна быць прамаркіраваная піктаграмай у выглядзе горнай вяршыні з трыма пікамі і сняжынкай унутры або знакамі M + S, M & S, M.S, MS, All seasons.




— Акрамя шын, кіроўцам неабходна планаваць час на паездку з улікам прагрэву аўтамабіля і больш павольнага хуткаснага рэжыму, быць вельмі ўважлівымі пры праездзе нерэгуляваных пешаходных пераходаў, а таксама памятаць аб павелічэнні дыстанцыі паміж аўтамабілямі пры руху на слізкіх участках дарог, — падкрэсліў суразмоўнік.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**


**Вниманию предприятий, организаций, индивидуальных предпринимателей и физических лиц!**

Фондом «Гроднооблимущество» проводится аукцион по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района

К ПРОДАЖЕ ПРЕДЛАГАЕТСЯ:

1. Изолированное помещение водолечебницы, расположенное по адресу: Волковысский район, д. Теолин, ул. Молодежная, 5-2.

Начальная цена продажи – 16360 рублей, размер задатка – 2000 рублей.

2. Изолированное помещение (сарай № 1 с погребом), расположенное по адресу: Гродненская область, г. Волковыск, ул. Победы, 81-1.

Начальная цена продажи – 460 рублей, размер задатка – 50 рублей.

Аукцион состоится 27 декабря 2018 года в 12.00

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

Последний день подачи заявлений на участие в аукционе 20 декабря 2018 до 17.00.

Подробная информация по телефонам:

В городе Волковыске: 8 (01512) 4 50 25, 2 07 46.

В городе Гродно: 8 (0152) 77 29 15, 72 25 18, 72 21 02.

Сайты: www.region.grodno.by, gki.gov.by.

УНП 500042135



**Извещение о проведении повторного аукциона по продаже земельного участка в частную собственность**

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-14

| **Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка** |
|---|
| Лот № 1. Земельный участок с кадастровым № 221288500601000039, площадью 0,1500 га, по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Туловский с/с, д. Асетки, ул. 3-я Асетковская, У-2, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: отсутствуют. **Нач. цена**: 1 470,00 бел.руб. **Задаток:** 147,00 бел. руб. |
| **Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 29.12.2018 в 11.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 13.12.2018 с 8.30 по 28.12.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY36AKBB36003141301470000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа – 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Туловский сельсовет). Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь, консолидированные участники (двое и более граждан Республики Беларусь) |

Аукционы проводятся в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Для участия в аукционе граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; в двухмесячный срок со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся обратиться в РУП «Витебское агентство по гос.регистрации и зем. кадастру» за гос. регистрацией прав на зем. участок; получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проект на строительство жилого дома в срок, не превышающий двух лет; в течение 1 года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта приступить к занятию зем. участка; осуществить строительство объекта в сроки, определенные ПСД; снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно ПСД. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Конт. тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by



ООО «Нелва» (224022, г. Брест, ул. Карьерная, 3В) принято решение (протокол внеочередного общего собрания участников № 27 от 13.12.2018) о досрочном погашении облигаций второго выпуска (государственный регистрационный номер выпуска ценных бумаг 1-401-02-2929) в количестве 250 шт. Дата досрочного погашения облигаций – 26.12.2018 г.

При досрочном погашении владельцам Облигаций выплачивается их номинальная стоимость, а также процентный доход, рассчитанный с даты, следующей за датой выплаты процентного дохода за предшествующий период, по дату досрочного погашения включительно.

Досрочное погашение Облигаций осуществляется Эмитентом:

в отношении лиц, указанных в реестре владельцев Облигаций, который формируется депозитарием Эмитента за 3 (три) рабочих дня до установленной даты досрочного погашения Облигаций;

путем перечисления в безналичном порядке на счета владельцев Облигаций причитающихся денежных средств в белорусских рублях по официальному курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь на дату досрочного погашения Облигаций, либо в валюте номинала Облигаций в соответствии с требованиями валютного законодательства Республики Беларусь.

Владельцы Облигаций обязаны осуществить перевод досрочно погашаемых Облигаций на счет «депо» Эмитента не позднее рабочего дня, следующего за днем перечисления Эмитентом денежных средств, необходимых для досрочного погашения Облигаций.

Обязанность Эмитента по досрочному погашению Облигаций считается исполненной с момента списания денежных средств со счета Эмитента по реквизитам счетов владельцев Облигаций.

УНП 809000101

Нефармат



# КАБ СУСТРАКАЦЬ НОВЫ ГОД НЕ АДНОЙ

**Умее ж яна здзіўляць. Упершыню здзівіла тады, як мы амаль выпадкова сустрэліся гадоў дзесяць таму, а можа і больш... Пасля кароткага настойлівага стуку дзверы кабінета адчыніліся, на парозе з'явілася яркая прывабная жанчына і літаральна агарошыла сваім пытаннем: «Гэта праўда, што на вашай шыльдзе напісана?» Ад нечаканасці я не адразу ўцяміла, што і адказаць. Па-першае, была занятая тэрміновай справай і перанастроіць мазгі імгненна на іншы лад — задачка не для мяне, ды і не сустракала я таго, каму прыйшло б у галаву пісаць на дзвярах свайго офіса няпраўду.**

Але раптоўна госця растлумачыла: «Што і казаць, перамяніліся мы за 20 гадоў. Каб не прачытала прозвішча, не пазнала б». Тады і я пачала ўспамінаць знаёмыя рысы. Гэтая дзяўчына вучылася на курс пазней, у інтэрнаце жыла на суседнім паверсе. Але перамены, якія адбыліся з ёй, з маімі, пэўна, не параўнаеш. Замест таго сціпленькага, амаль непрыкметнага дзяўчаці з райцэнтра стаяла з густам нафарбаваная, стыльна апранутая і, галоўнае, упэўненая ў сабе жанчына. «Ці гэта ты, Галя?» — толькі і спытала я.

— А хто ж яшчэ, — засмяялася мая суразмоўніца. — Выпадкова тут аказалася, тваім суседзям, — паказала на кабінет побач, — участак зямлі прадаю пад забудову, заехала, каб уладзіць некаторыя фармальнасці.

Мы з Галінай некалі нават уступныя экзамены разам здавалі, жылі ў адным пакоі. Праўда, ёй пашанцавала менш, і паступіла яна толькі на наступны год. А вось пра тое, што жывём у адным горадзе, я нават не падазравала. Потым мы сустракаліся не раз. І я даведалася, што Галіна Пятроўна стала гаспадыняй сярэдняй велічыні турыстычнай фірмы, забяспечанай, незалежнай жанчынай. Па выглядзе і інтанацыі здавалася, што ў яе шчаслівая сям'я, ва ўсім жыцці пануе размеранасць і гармонія. Ды і не цярпелася даведацца, як становяцца бізнес-лэдзі.

Аказалася, што становяцца, бывае, не дзякуючы, а насуперак. Толькі цяжка вызначыць чаму: каханню, страсці, пошукам гэтых пачуццяў... Пасля разводу з мужам-вайскоўцам і вяртання з Германіі яна ледзьве ўладкавалася ў аддзел кадраў шараговай арганізацыі. Сяк-так прыватызавала пакой у сямейным інтэрнаце. І вырашыла, што ім з сынам гэтага хопіць. Можа, і зараз жыла б на ўскрайку горада, каб не сустрэла сваё ракавое каханне. Як яна сказала, трапіла ў залежнасць, нібы алкаголік ці наркаман. Пачуць голас стала — як атрымаць дозу таму, хто блізкі да ломкі. З самага пачатку было ясна, што той чалавек не збіраецца нічога мяняць у сваім жыцці. Як і зразумела, што ў гэты кут загнала сябе сама і выбірацца адтуль трэба самой. Хадзіла да псіхолагаў, чытала разумныя кніжкі, пакуль не ўсвядоміла, што неабходна мяняць усё і адразу. Рызыкнула пачаць сваю справу, і пачало атрымлівацца! Работа, як вядома, лечыць, тым больш што яна адбірала ўвесь час. Потым паявіліся грошы, за імі кватэра, машына, бізнес пашыраўся. У «той бок» нават думаць сабе забараніла. І заўсёды выглядала вясёлай, шчаслівай, упэўненай.

На гэты раз мы зноў доўга не бачыліся і сустрэліся, як заўсёды, амаль выпадкова. Галіна паведаміла, што выйшла замуж.

— ?!

— Ну так. Гаварыла, што больш мяне на гэтую прынаду жыццё не зловіць. Гаварыла, няма дурных. Дык так і ёсць. Цяпер — ніякіх жарсцяў, ніякага пякельнага кахання. Цяпер — другое. А ведаеш, чаму сышлася з гэтым чалавекам? Каб Новы год адной не сустракаць. Раней, калі сын быў са мной, яшчэ сяк-так, а калі ён вырас і сышоў, святы для мяне сталі ледзь не выпрабаваннем... Не, мы на фірме ладзім карпаратыў, адзначаем як след. А 31-га я ўсіх павіншую, раней адпушчу, бо ўсе бягуць да сем'яў, да святочных сталоў. Сама прыходжу дадому, пашвэндаюся з кута ў кут, да сваіх сямейных сябровак ісці не хачу, радні ў мяне тут няма. Стараюся раней легчы спаць, каб не ўключаць тэлевізар, не чуць гэтага грукату петардаў, але ж усё роўна выбухі потым разбудзяць. Ляжыш, думаеш, сябе шкадуеш. Так было яшчэ два гады таму.

А цяпер мы разам сядзем ціхенька пад ёлачкай, і так спакойна, утульна. Можна было б куды ехаць, браць тур. Але мой Уладзімір Фёдаравіч зусім не любіць пералётаў, далёкіх дарог. Я часта падарожнічаю нават па роду дзейнасці. Прыеду, скіну здымкі на камп'ютар, разам разглядаем, мне цікава яму расказаць і паказаць. Ён любіць кнігі, шмат чытае. Раскажа, што прачытаў, а мне цікава слухаць. Бывае, прыйду з работы, стомленая, заведзеная, злая, а ён ціха скажа: «Я тваю любімую запяканку тварожную прыгатаваў». І я нібы іншая станаўлюся, нібы тая жаба, скуру з сябе скідваю. І наогул, ведаеш, як добра Новы год сустракаць дома ўдваіх! Раней я кампаніі шумныя любіла. А можа, мне падавалася, што любіла...

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.20 | 16.47 | 7.27 |
| Віцебск — | 9.17 | 16.29 | 7.12 |
| Магілёў — | 9.10 | 16.37 | 7.27 |
| Гомель — | 8.58 | 16.42 | 7.44 |
| Гродна — | 9.34 | 17.04 | 7.30 |
| Брэст — | 9.26 | 17.13 | 7.47 |

### Месяц

*Маладзік 7 снежня.*
*Месяц у сузор'і Рыб.*

### Імяніны

*Пр.* Андрэя Першазванага.
*К.* Люцыі, Юліі, Пятра, Уладзіміра.



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

## ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**13 СНЕЖНЯ**




**1891** год — у Мінску гарадская дума прыняла пастанову «Аб зборы з сабак», у адпаведнасці з якой гаспадары сабак, заплаціўшы 1 рубель (дзённы заробак рабочага) атрымлівалі значок, якім легалізоўвалі сваё права на жывёлу. Значок прымацоўваўся да ашыйніка чатырохногага члена сям'і. На гаспадароў сабак без значка накладаўся штраф.

**1943** год — на шашы Мінск — Слуцк каля вёскі Цялякава Уздзенскага раёна адбыўся бой партызанскіх брыгад — 200-й імя Ракасоўскага, 300-й імя Варашылава і 27-й імя Чапаева — супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў, які ўвайшоў у гісторыю Вялікай Айчыннай вайны пад назвай Цялякаўскі бой. У засаду, якую зрабілі партызаны на шашы, трапіла буйная нямецкая аўтакалона. У ходзе бою партызаны знішчылі 52 варожыя аўтамашыны, два браневікі, было забіта і паранена больш як 200 гітлераўцаў. 14-гадовы разведчык брыгады імя Ракасоўскага М. Казей (будучы Герой Савецкага Саюза) забіў гітлераўскага палкоўніка і захапіў яго партфель з каштоўнымі аператыўнымі дакументамі, што дазволіла партызанскаму камандаванню сарваць шэраг варожых карных экспедыцый. У выніку Цялякаўскага бою на некалькі дзён былі спынены перавозкі ворага па шашы Мінск — Слуцк.




**1577** год — малады марак Фрэнсіс Дрэйк — будучы англійскі рыцар, пераможца «Непераможнай армады» і «пірат Яе Вялікасці» — адправіўся з Плімута ў сваю першую сур'ёзную экспедыцыю. Перад пяццю скараходнымі парусьнікамі стаяла некалькі задач. Яны павінны былі нанесці максімальную шкоду іспанскім каланіям у Новым Свеце, знайсці паўночны праход з Ціхага акіяна ў Атлантыку, узяць груз тавару на інданезійскіх астравах, а таксама абысці вакол свету.

**1873** год — нарадзіўся Валерый Брусаў, рускі паэт, празаік, крытык, літаратуразнавец, прафесар, ганаровы член Інстытута беларускай культуры. Заснавальнік сімвалізму ў рускай літаратуры. Арганізатар і рэктар Вышэйшага літаратурна-мастацкага інстытута ў Маскве. З беларускай паэзіяй пазнаёміўся ў жніўні 1914-га ў Вільні, дзе сустрэўся з Я. Купалам. Пераклаў на рускую мову шэраг яго вершаў. На беларускую мову творы Брусава перакладалі А. Александровіч, Ю. Гаўрук, С. Дзяргай, А. Дудараў. Памёр у 1924 годзе.



**1902** год — нарадзіўся Яўген Пятроў (Я. П. Катаеў), савецкі пісьменнік, суаўтар Ільі Ільфа, з якім напісаў раманы «Дванаццаць крэслаў» і «Залатое цяля». Памёр у 1942 годзе.

**1908** год — нарадзіўся Расціслаў Янавіч Плят, савецкі акцёр тэатра і кіно, народны артыст СССР, Герой Сацыялістычнай Працы. Здымаўся ў фільмах «Падкідыш», «Вясна», «Іду на навальніцу», «Памылка рэзідэнта», «Сямнаццаць імгненняў вясны» і іншых. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Памёр у 1989 годзе.

## УСМІХНЕМСЯ

**Быць дарослым — гэта чакаць не навагодняга цуду, а навагодняга карпаратыву.**

Жонка:
— Дык мне купляць гэтую прыгожанькую сумачку?
Я (*не адрываючыся ад работы*):
— Так, бяры...
Жонка:
— Блін, з табой адны растраты!

**Мая жонка па кожным пытанні мае два меркаванні, і абодва канчатковыя, таму мне даводзіцца даволі цяжка...**


caricatura.ru


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4527.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 12 снежня 2018 года.